Чаго тут зайздросціць? ☞ 4

Ніва

ТЫДНЁВІК БЕЛАРУСАЎ У ПОЛЬШЧЫ

PL ISSN 0546-1960

NR INDEKSU 366714

Людвік Заменгоф ☞ I-IV

http://niva.iig.pl

redakcja@niva.iig.pl

№ 30 (2776) Год LIV | Беласток, 26 ліпеня 2009 г. | Цана 2,00 зл. (VAT 0%)

„Басовішча” — было, ёсць і будзе

Тэкст і фота Ілоны КАРПЮК

— Праўда гэта, што пабілі беларуса? — тэлефануюць у нядзелю знаёмыя з розных СМІ. — Палякі пабілі за тое, што ён беларус?!

Можа і пабілі. Дарэчы, не аднаго беларуса, не аднаго паляка і не толькі на фестывалі „Басовішча”. Там, дзе ёсць піва ці гарэлка ды мужчынскі гонар, з вякоў бываюць і спрэчкі. Мой муж не вытрымаў таксама і ў пэўны момант хацеў паказаць аднаму падхмеленаму, што жанчын нельга зачапаць у непрыстойны спосаб. Але „Басовішча” ў пэўным сэнсе для гэтага і ёсць — каб у вакацыйны перыяд падкарміць галодныя гарачых тэм газеты. Няхай пішуць, разважаюць і страшаць нас ксенафобіяй. Кожны, хто прыязджае на „Басовішча”, дасканала ведае і разумее, што галоўнае тут гэта быць разам, выпіваць разам, наракаць разам, разам цешыцца і стагнаць. Вось і цэлая ідэя.

— Выпі са мной! — заклікала са сцэны на другі дзень юбілейнага выпуску фестывалю мінская „Крама”. Яны разумеюць лёс чалавека і яго патрэбы, таму і на канцэрт такіх легендарных гуртоў прыязджае многа слухачоў. Субота была безумоўна днём плывучай ад музыкі радасці. І зоркі былі, і гук час ад часу нядрэнны. Самы вялікі натоўп чакаў польскага госця — гурту „Ляо Чэ”. Канцэрт разварушыў публіку, пакідаючы людзей разагрэтымі і патрабуючымі энергіі „Нейра Дзюбеля”. Як звычайна атмасферу супакоіў „Уліс”. Невядома да сёння ці людзі не гуляюць у час яго канцэртаў таму, што чакаюць цуду, ці проста яны так заслуханы ў творчасць Славы Кораня ды яго гурту. Фінал быў у руках „Н.Р.М.”.

— Няма тэлебіма, — з жалем паўтарае пад носам Аня Вольская. — Меў быць, мы спецыяльна падрыхтавалі візуалізацыю пад канцэрт „Мроі”...

І мне за горла сціснула, калі я ўжо пасля фестывалю глядзела гэты матэрыял, рарытэтныя здымкі і газеты, якіх выявы прэзентаваліся на падрыхтаванай прэзентацыі. Але і без таго канцэрт „Н.Р.М.”, праведзены ў палове на аснове творчасці „Мроі” ды ў такім жа антуражы, здаваўся мне найбольшай кампенсацыяй за ўсе недахопы фестывалю.

— Вось мая зямля пад нагой бяжыць, — спявалі, падбягаючы да мяне, сябры неяк не давяраючы, што можна было гэтую песню пачуць ужывую!

На тым і канчаюцца акцэнты, якімі рэкламавалі фэст арганізатары.

— Вяртанне да пачаткаў... паказаць гісторыю фестывалю... — такія словы паяўляліся вельмі часта яшчэ да фестывалю, але з гэтым справіўся толькі „Н.Р.М.”. Віктар Шалкевіч стараўся быць прыстойным вядучым, але, здаецца, да канца так і не змог панесці публіку на хвалі сваёй харызмы. Яго асоба спалучыла, мабыць, сённяшняе з далёкім прошлым, але не было ў гэтым новай энергіі, можа толькі некаторыя задумаліся над дваццаццю выпускамі фестывалю, над роляй Сержука Сокалава-Воюша і яму падобных. Дарэчы, мне асабіста вельмі не хапала шпацыруючых між людзьмі Касі Камоцкай ці згаданага Сержука Сокалава-Воюша. Усмешку прыводзілі затое заўсёднікі, такія фестывальныя „тубыльцы”, якіх постаці выразна вылучаліся на фоне ўсіх гледачоў. Яны зашмат не наракаюць, яны ведаюць, што атмасфера месца і так адзіная такая ў свеце.

— Тут лес сам усё гаворыць, — расплываўся ва ўспамінах Андрэй Карчэўскі, адзін з ранейшых арганізатараў. Другі былы арганізатар пераконваў, што гэта фестываль шматлікіх ідэй, што мне вельмі спадабалася. У арганізатараў выспела ідэя наладзіць фестываль, з маладымі ліцэістамі прыязджае ідэя ўпершыню напіцца з сябрамі піва і паслухаць адзін раз у год такой колькасці беларускай музыкі, старэйшыя прыязджаюць паглядзець змены, сустрэць колішніх сяброў і нацешыцца малой падляшскай Беларуссю, а беларусы з-за мяжы прыязджаюць, каб на бліжэйшы час нацешыцца бел-чырвона-белым сцягам — сімвалам сапраўднай свабоды. Гэта зразумела агульны фон, але насамрэч так і ёсць, паколькі кожны з нас мае сваю мэту. Для мяне важнае, каб адчуваць безупынна, што гэта наш фестываль. Наш, значыцца беларускі, але і падляшскі, свойскі, не чужы. Хочацца там быць і ганарыцца перад іншымі, што сёлета некаторым прыходзіла цяжка.

— Мне крыху сорамна за гэты юбілей, — прызнаўся мой гарадоцкі сябра, — бо дзе ён і ёсць? Праўда, у суботу можа і зоркі выступаюць, але дзе гэтыя ўсе выстаўкі, сустрэчы, дзе прыстойны гук, дзе экран, каб свайго куміра пабачыць бліжэй, дзе буйнае святло. Няма як гэтым юбілеем нават цешыцца.

— Праз год будзем адзначаць дваццацігоддзе „Басовішча”! — ганарліва падкрэсліваюць маладыя басаўцы, але, здаецца, такі юбілей як дваццатка адзначаецца толькі раз, пра што, дзякуючы Лявону Вольскаму і яго камандзе, будзем помніць да, дай Божа, наступнага дзесяцігоддзя. Хочацца гэтага дачакаць і не змарнаваць такой выдатнай спадчыны падляшскай беларускасці, бо кожны год пашыраецца кола фанатаў гэтага месца, атмасферы, нават самога чакання чарговага выпуску. І не мае тут значэння ні нацыянальнасць, ні ўзрост ці прафесія, бо ў Борык едуць студэнты, сем'і, матацыклісты і цыклісты, доктары і навукоўцы, палякі і амерыканцы. На „Басовішчы” мы проста ўсе такія ж самыя: вольныя. Гэтае слова ніколі не будзе пазбаўленае сэнсу і вартасці. Так было, ёсць і будзе.

Свіслач • Гародня • Ваўкавыск • Шчучын • Гайнаўка • Высокае • Масты • Беласток • Бельск Падляшскі • Сямятычы

98,1 FM

БЕЛАРУСКАЕ РАДЫЁ РАЦЫЯ

www.racyja.com

Здольнасці для чужых ☞ 2

Уладзімір ХІЛЬМАНОВІЧ

Эміграцыя — з'ява ў гісторыі чалавецтва даўняя і старая як сам свет. Выязджаюць людзі са сваёй краіны ў вялікіх маштабах па дзвюх прычынах — альбо ратуюцца ад вайны, альбо ўцякаюць ад беднасці ў пошуках лепшай долі. З гісторыі Беларусі апошніх 120-130 гадоў вядомы некалькі масавых хваляў эміграцыі, пераважна за моры і акіяны...

Таленту — колькі ў небе зор! ☞ 2

Міра ЛУКША

На сёлетняе Купалле ў Белавежы, апрача гасцей з Беларусі, найдалей мелі прадстаўнікі з-пад Мельніка і Сямятыч. Давялося іх прыху пачакаць у гэты магічны феерверкава-дажджлівы вечар. Жанчыны з Машчоны-Каралеўскай, з „Навіны”, паспелі на хаду яшчэ пераапрануцца ў новыя беларускія строі і ўжо пад кроплямі дажджу далучыліся са сваім вянком да карагода...

З'езд „Бацькаўшчыны” ☞ 10

Міра ЛУКША

„Басовішча -2009” ☞ 12

фотарэпартаж Ілоны КАРПЮК

9 770546 196000

Здольнасці для чужых

Эміграцыя — з'ява ў гісторыі чалавецтва даўняя і старая як сам свет. Выязджаюць людзі са сваёй краіны ў вялікіх маштабах па дзвюх прычынах — альбо ратуюцца ад вайны, альбо ўцякаюць ад беднасці ў пошуках лепшай долі. З гісторыі Беларусі апошніх 120-130 гадоў вядомы некалькі масавых хваляў эміграцыі, пераважна за моры і акіяны. Вазьмуся сцвярджаць, што зараз наша краіна перажывае чарговы ўздым ад'ездаў за мяжу. І апошнія дзесяць гадоў тэндэнцыя толькі нарастае. Прычым з'язджаюць насельнікі краіны маладога і сярэдняга ўзросту па прынцыпе „абы куды, абы з'ехаць". Цяперашняя ўлада любіць выстаўляць сваёй заслугай тое, што зараз мірны час і няма вайны. Хоць прычым тут яна, улада, і чаму менавіта ёй трэба дзякаваць за мірнае неба над галавой? Але тое, што вайны ў класічным разуменні няма — праўда. Значыць, уцякаюць людзі з краіны па прычыне беднасці і немажлівасці легальнай рэалізацыі сваіх планаў, праектаў, вынаходніцтваў, здольнасцей і талентаў. Не вабіць іх той „сацыяльны рай", пра які так шмат гаворыцца з экранаў і старонак газет дзяржаўных хлуслівых медый.

Нехта можа запярэчыць, што такая ж сама карціна назіраецца зараз і ў дэмакратычных суседніх Польшчы і Літве, ды і практычна ва ўсіх краінах Усходняй Еўропы. Так то яно так, але не забывайцеся, што там пры ўсіх праблемах, гэта пытанне выключна эканамічнага выбару — людзі проста хочуць жыць лепш і зарабляць больш. Ніхто прынамсі не галадае. Выбіраюць паміж дабрабытам і заможнасцю, а не паміж галечай і дабрабытам. Ніхто там у Польшчы, ці Літве, не душыць іх ідэалагічна, не прымушае хадзіць на вайсковыя парады і дэманстрацыі па ўслаўленні кіраўніцтва краіны.

Асобнае пытанне — дыскрымінацыя талентаў паводле прыналежнасці да мовы тытульнай нацыі. Лепшыя беларускія творцы, якія застаюцца на радзіме, папросту пазбаўлены магчымасці шырокай аўдыторыі. Мы не бачым іх ні па тэлебачанні, ні ў вялікіх залах. А можаце ўявіць сабе, каб хтонебудзь з Маладога фронту атрымаў у Беларусі прэзідэнцкую стыпендыю? Не, яе могуць атрымаць толькі маладыя канфармісты з гнуткімі хрыбтамі і шыямі, з „правільнымі" і паслухмянымі паводзінамі. Крытэрый здольнасцей і таленту ў дзяржаве Рэспубліка Беларусь абсалютна другасны, першасны ж і галоўны — гэта адданасць ідэалагічнаму курсу. Прытым сам ровень навучання, асабліва гуманітарнага, цэлы час зніжаецца.

Ці змаглі б бацькі хлопчыка Сашы Рыбака, добрыя, але не геніяльныя музыканты, даць свайму сыну прыстойную адукацыю тут, вывесці яго ў пераможцы Еўрабачання, каб не з'ехалі ў Нарвегію? Бо колькі ў Беларусі зарабляюць музыканты, ці выкладчыкі музыкі? Вось таму і змушаны яны, хто яшчэ не з'ехаў назаўсёды, летнімі адпачынкамі выбірацца ў Заходнюю Еўропу і зарабляць граннем на вуліцах. Ды гэта музыканты, а куды падзецца якому-небудзь трэнеру дзіцячай спартовай школы, які ледзь-ледзь можа пракарміць сям'ю. Гэта толькі вялізныя хакейныя палацы будуюцца з вялікай пампезнасцю. А колькі атрымліваюць дзіцячыя трэнеры нават гаварыць не хочацца. Вось таму і працуе былы слаўны футбаліст Сяргей Гоцманаў кіроўцам школьнага аўтобуса ў ЗША, а не ў Мінску. Вось таму і рвуць усе, хто толькі можа, за мяжу. Хто не можа, ці не наважыўся, стараюцца выслаць дзяцей — ці на вучобу, ці на працу. За мяжой зараз пражывае каля трох мільёнаў беларусаў, пераважная бальшыня з якіх губляе нацыянальную ідэнтычнасць. Губляе таму, што за плячыма няма нармальнай метраполіі.

Але нейкі голас крыві ўсё ж цягне таленты да свайго. Той жа Аляксандр Рыбак праспяваў па-беларуску славутую „Купалінку", а цяпер будзе рыхтаваць беларускамоўны варыянт сваёй ужо знакамітай „Казкі". Спявачка Вольга Казак, узыходная зорка амерыканскай эстрады, мае ў сваім рэпертуары і творы на мове бацькоў. А на днях уключыў тэлевізар ды вушам і вачам не паверыў — прадстаўнік Расіі на „Славянскім базары" пранікнёна і чыста выводзіў словы беларускай песні! Аказалася Дзмітрый Даніленка, таксама наш хлопец з Гомеля, які ўрэшце і ўзяў Гран-пры фестывалю.

Беларусь працягвае раздаваць свае таленты іншым...

Уладзімір ХІЛЬМАНОВІЧ

Таленту — колькі ў небе зор!

На сёлетняе Купалле ў Белавежы, апрача гасцей з Беларусі, найдалей мелі прадстаўнікі з-пад Мельніка і Сямятыч. Давялося іх прыху пачакаць у гэты магічны феерверкава-дажджлівы вечар. Жанчыны з Машчоны-Каралеўскай, з „Навіны", паспелі на хаду яшчэ пераапрануцца ў новыя беларускія строі і ўжо пад кроплямі дажджу далучыліся са сваім вянком да карагода; разам з Маркам Скамароўскім з Боцькаў і часткай сямятыцкай „Падляшскай капэлы", ды гарманіст са строямі сямятыцкіх музыкаў дабраўся ў Белавежу аж напрыканцы мерапрыемства, — так што выйшлі яны на сцэну разам ужо аж перад выступам мінскага „Белага птаха". Стройныя мінскія танцоркі, здаецца, зайздросна ўзіраліся ў цудоўныя ўзоры строяў навінскіх самавітых кабет, якія атрымалі нядаўна: „Мы чакалі аж два гады на новыя!" А Марк Скамароўскі выбраў быў таксама харошае сцэнічнае адзенне: ільняны жупан, які хораша ляжыць на яго магутнай постаці. І заспявалі яны на белавежскай сцэне ягоны гіт „Колькі ў небе зор" ды, каб разварушыць крыху закляклую на дажджы публіку, яшчэ і „Смэрэку"!

„Колькі ў небе зор" з'яўляецца гітам не толькі беларускіх фэстаў. Марк не можа нацешыцца: адспяваў яе пару дзён раней перад мільённай публікай!

— Гэта быў, можна сказаць, чысты выпадак! — смяецца Марк Скамароўскі. — Былі мы ў Варшаве ў маі на прамоцыі Падляшскага ваяводства на Тэатральным пляцы. Непадалёк гэтага пляца праводзіўся першы касцінг да праграмы „Маю талент". На прамоцыі былі таксама іншыя калектывы, якія прадстаўлялі наша ваяводства. Мы былі разам з калектывам з Машчоны-Каралеўскай, ужо ад шмат гадоў трымаем з імі кампанію. І кабеткі кажуць, вось: ідзем, застартуем! І пайшлі мы, можна сказаць, Падляшская капэла з „Навінай", з ходу, запоўнілі анкеты (там трэба было напісаць шмат што пра сябе, даныя, зацікаўленні...). І выступілі мы перад камісіяй, здаецца, у пятнаццаць асоб. Камісія, пасля майго выканання песні „Колькі ў небе зор", аднагалосна сцвердзіла, што гэта было прыгожае. Папрасілі нас, каб мы хвілінку засталіся. Праз хвілін пятнаццаць завялі нас у другое памяшканне, дзе ўжо былі адпаведныя банеры, устаноўленыя пражэктары, камеры. Тут ужо зрабілі нам фільмавыя здымкі. Сказалі, што да канца тыдня нас павядомяць па тэлефоне аб запісе ў праграму. Так і было. Праз тыдзень пазванілі мне і маім сябрам, што дасталіся мы ўжо ў праграму. І трэба прыехаць у Варшаву 30 чэрвеня або 1 ліпеня. Мы рашылі, што прыедзем 1 ліпеня, у сераду. Прыехалі. Касцінг праводзіўся ў Драматычным тэатры ў Палацы культуры і навукі.

— Назіраючы за гэтымі людзьмі, у якіх відаць сапраўды вялікі талент, я крыху пабойваўся, — уздымае Марк. — Найбольш таго, што член журы пан Куба Ваявудзкі, сапраўды вельмі рэзкі ў языку, зробіць так, што нам стане сапраўды прыкра. Калі паклікалі нас на сцэну, каб мы адрэкамендаваліся, пасля інтэрв'ю, якое праводзіў з намі пан Марцін Пракоп, які даведаўшыся, што мы з Падляша, сказаў для нас знамяльныя словы: „Chłopaki, trzymajcie się! Pokażcie klasę". Ну, дык пакажамся, годна адрэкамендуемся!

Так і было.

— Калі хлопцы іграліі я спяваў, зала замоўкла. А па зале паплыў моцны барытон. Скажу шчыра, што рэдка мне так спявалася. Я адчуваў сябе ў сваім рэпертуары вельмі добра. І гэта мы адчувалі разам. Ды ўвесь час назіраў я за камісіяй. Вядома, члены журы маюць перад сабой кнопкі, і калі не падабаецца выступленне, кожны з іх можа націснуць сваю кнопку і спыніць прэзентацыю выканаўцы. Праспяваў я адну страфу, ніхто нас не спыняе... Другую... Божа, што такое?! А поўная зала гледачоў махае нам рукамі ў рытм песні, хвалюецца. Знакаміта гуляюць. Падабаецца ім наша песня! Чакаем ацэнкі. Кажа пан Ваявудзкі: „Я ўрэдны, ніхто мяне не любіць. Я заўсёды на „не". А сёння я скажу, што на „так"!" Пані Малгажата Фарэмняк заявіла, што прыгожа мы выступілі, а ёй прыгадалася дзяцінства, такая меланхолія, але яна не бачыць фальклору ў гэтай праграме. А пані Агнешка Хылінская наадварот: кажа, што бачыць фальклор у праграме „Маю талент" і вельмі ахвотна ўбачыць нас у паўфінале. І такім чынам гэтая цудоўная беларуская песня пайшла ў агульнапольскі эфір, у нашым выкананні, усяе „Падляшскай капэлы". Была яна добрым амбасадарам нашых зямель. Я заўсёды, таксама і тады ў Варшаве, кажу, што няма такой прыгожай краіны як Падляша.

Міра ЛУКША

Вачыма еўрапейца

Кароткая памяць

У адной з лакальных газет паказаўся артыкул пад знамянальным загалоўкам: „Język się plącze". Журналістка праехалася па некалькіх беластоцкіх вёсках. Распытвалася ў жыхароў, што скажуць яны на прапанову Міністэрства ўнутраных спраў і адміністрацыі наконт змены назваў іх месцаў жыхарства. Спісак такіх вёсак, хутароў, лясных паселішчаў і прысёлкаў на патрэбы МУСіА апрацавала спецыяльная Камісія назваў мясцовасцей і фізіяграфічных аб'ектаў. Агулам на Падляшшы гаворка аб 62 мясцовасцях. У прапановах вяртання першапачатковых назваў камісія спасылалася на гістарычныя першакрыніцы з XVI-XX стагоддзяў, карты, геаграфічныя слоўнікі, спіскі мясцовасцей, гербоўнікі і акты, такія як унія Польшчы з Літвой з перыяду 1385-1791 гадоў. Гаворка аб мясцовасцях, у якіх пражывае ў пераважнай большасці беларуская меншасць — у Крынкаўскай, Сакольскай, Гарадоцкай, Нараўчанскай, Нарваўскай, Сямятыцкай, Дубіцкай, Арлянскай, Кляшчэлеўскай гмінах. У згаданым матэрыяле журналістка размаўляла з жыхарамі Градочна, Трасцянкі, Гайдукоўшчыны і Богуш. Усе былі супраць старых-новых назваў. Калі гаворка, напрыклад, пра Богушы (Bogusze), журналістка інфармавала: „Нават найстарэйшы жыхар вёскі, які нарадзіўся ў 1920 г., не памятае, каб яны калі-небудзь былі Богушы (Bohusze)". У іншым месцы: „Нашто дурыць людзям галовы?" — махае рукой Анастазія Сіняковіч з Трасцянкі. Яшчэ ў іншым: „Я сабе гэтага нават не ўяўляю", — рашуча заяўляе Веслава Ваўжэнюк з Гайдукоўшчыны.

Прадстаўніца газеты размаўляла таксама з прадстаўніком самаўрада — адным адзіным (!!!), значыць, з рашучым праціўнікам змен назваў мясцовасцей, асабліва распаложаных на тэрыторыі яго гміны — Якубам Садоўскім, войтам Нарваўскай гміны. „Спробы змены назваў мясцовасцей выклікаюць у нас абурэнне. Тут генеральна людзі прывыклі ўжо да назвы і адабраюць яе". Вядома, так, як у тэксце ў сённяшняй „Ніве" (стар. 4), войт Садоўскі ў сваіх ідэях „крыты", спасылаецца ўрэшце на думку жыхароў, на свой электарат (выбары ў самаўрад ужо ў наступным годзе). Падобна, дарэчы, робіць шмат іншых войтаў, з якімі ў сваю чаргу размаўлялі мы. Рашыў я спрабаваць на сваю руку растлумачыць, па прычыне недахопу месца, у скарочаным выглядзе: адкуль ідэя ўвядзення старых-новых назваў, а ў прынцыпе згоднасці з іх першапачатковым або і таксама іх гучаннем у гаворцы, якога нават найстарэйшыя жыхары могуць не памятаць, як той 89-гадовы жыхар Богушаў. Вось, возьмем тыя Богушы (Bohusze). Так было запісана ў дакументах ад 1569, 1601, 1669, 1744, а нават яшчэ ад 1921 гадоў. Пэўна толькі гісторыкі, добра ведаючыя тэму, могуць адказаць на пытанне як гэта здарылася, што за сталінскім часам (1952 г.) раптам вёска стала называцца Bogusze. Trześcianka магла б стаць Трасцянкай, як гэта было вякамі. Тшэсцянка паяўляецца толькі ў спіску назваў мясцовасцей аж у 1962 г. Амаль таксама было з іншымі мясцовасцямі. Аказваецца, вось, што гэтак званая гістарычная памяць шмат якіх беларусаў Беласточчыны — кароткая, а затым, на маю думку, у сімвалічным, але ў поўным маштабе — сумніўнай з'яўляецца іх нацыянальная самасвядомасць. І замест падагульнення. Пасля грамадскіх кансультацый, праведзеных у 62 мясцовасцях, Падляшская ваяводская ўправа пераслала дагэтуль МУСіА меркаванні ў справе змены назваў з сарака дзвюх. Толькі ў адным выпадку самаўрад і мясцовыя выказаліся пазітыўна. Згодна з прапановай камісіі мясцовасць Бабковы Груд магла б называцца Bobkowy Hrud; у беларускім гучанні значыць той груд сухое месца, распаложанае на ўзвышшы над падмоклым. З жыхарамі гэтай калёніі журналістка мясцовай газеты не палічыла патрэбным размаўляць.

Мацей ХАЛАДОЎСКІ

Ці закончыцца толькі на дыскусіі?

Тэкст і фота Аляксея МАРОЗА

Зараз у Белавежы і яе наваколлі, напрыклад у Пагарэльцах (на здымку), людзі яшчэ жывуць прапановай пашырэння парку і патрэбныя сустрэчы з імі прынамсі прадстаўнікоў Міністэрства асяроддзя, каб высветліць усе боязі і недаразуменні

Мінула ўжо крыху часу ад абвяшчэння прапановы аб дапамозе для пушчанскага і прыпушчанскага насельніцтва ў рамках прадугледжванага пашырэння тэрыторыі Белавежскага нацыянальнага парку на ўсё Белавежскае і частку Броўскага надлясніцтваў. У самой Белавежы і наваколлі не спыняюцца дыскусіі аб чарговай спробе павелічэння парку. Гэта ж іх радныя да канца жніўня вырашаць: згадзіцца ці не на пашырэнне нацпарку. Зараз вядуцца размовы паміж прадстаўнікамі Міністэрства асяроддзя і самаўрадаўцамі Гайнаўшчыны ў справе магчымай дапамогі для мясцовага насельніцтва і падтрымкі гмінных інвестыцый, бо першапачатковая прапанова міністра асяроддзя Мацея Навіцкага не задаволіла самаўрадаўцаў. Апошнім часам прадстаўнікі Міністэрства асяроддзя завяраюць нашых самаўрадаўцаў, што фінансавая дапамога пойдзе не толькі ў згаданыя дзве гміны і Гайнаўку, але будзе накіравана да ўсіх гмін Гайнаўшчыны.

— У першай палове ліпеня адбылася сустрэча прадстаўніка міністра асяроддзя з войтамі і бурмістрамі нашага павета. Зараз можна гаварыць толькі аб 100 мільёнах злотых дапамогі з Нацыянальнага фонду аховы асяроддзя для нашага рэгіёна і аб гэтых грошах ішла гутарка ў час сустрэчы, — паінфармаваў адзін з войтаў з Гайнаўшчыны, што прымаў удзел у спатканні. — Шкада, што ўвогуле не гаворыцца аб дафінансаванні рамонтаў дарог. Зараз таксама малая магчымасць атрымаць грошы на будову каналізацыі. Патрабуецца, каб на кожны кіламетр каналізацыйнай сеткі было падключаных да яе 120 асоб. Найчасцей у нашых гмінах няма нават магчымасці падключыць 100 асоб і таму вельмі цяжка будзе нам пакарыстацца грашамі з Нацыянальнага фонду аховы асяроддзя. Прапануецца нам будаваць яшчэ больш ачышчальняў сцёкаў і вакол іх разбудоўваць каналізацыйныя сеткі, згодна з еўрасаюзнымі патрабаваннямі. Аднак да еўрасаюзных сродкаў выдаткаваных на будову ачышчальняў сцёкаў трэба было б далажыць яшчэ многа сваіх грошай і таму гэтая прапанова не вырашыць нашых праблем.

Ад майго суразмоўцы-войта даведаўся я, што прадстаўнік Міністэрства асяроддзя прапанаваў выдзяляць таксама сродкі, якімі маглі б карыстацца няўрадавыя арганізацыі пры рэалізацыі праектаў на пушчанскай і прыпушчанскай тэрыторыі. У асноўным сродкі ў рамках Белавежскай праграмы развіцця можна было б атрымліваць на праэкалагічныя інвестыцыі. Калі гаварыць пра выкарыстанне дапамогі для індывідуальных асоб, маглі б яны карыстацца грашамі на тэрмамадэрнізацыю (уцяпленне) дамоў. Жыхары пушчы маглі б выступаць за сродкі на будову прыватных ачышчальняў сцёкаў для дамоў, распаложаных па-за кампактнымі паселішчамі.

— Войты Белавежскай і Нараўчанскай гмін гаварылі, што іх радныя яшчэ не гатовы даць станоўчы адказ на прапанову пашырэння парку. Перад раднымі вялікая адказнасць і могуць яны апасацца прыняць рашэнне ў справе больш строгай аховы, не ведаючы аб канкрэтнай дапамозе. Пасля людзі маглі б абвінавачваць іх у тым, што прадалі пушчу за сімвалічныя сярэбранікі. Аднак усё яшчэ магчымае і калі б Міністэрства асяроддзя запрапанавала большыя сродкі для Белавежскай і Нараўчанскай гмін, на канкрэтныя інвестыцыі, якіх будуць патрабаваць самаўрадаўцы, могуць яны яшчэ даць згоду на пашырэнне парку. Мы ўшануем абодва рашэнні белавежскіх і нараўчанскіх радных, паколькі гэта ім прыйдзецца разлічыцца перад выбаршчыкамі, але калі загаласуюць „за” можам і скарыстаць на гэтым, — сказаў адзін з войтаў.

Прэс-сакратар Міністэрства асяроддзя Магда Сікорска нядаўна заявіла, што Белавежская праграма развіцця толькі адкрывае запланаваную на два месяцы дыскусію наконт будучыні парку і рэгіёна і дабавіла, што калі ў прадстаўнікоў самаўрадаў з'явіліся нейкія недаразуменні, дык у час сустрэч яны будуць высвятляцца. Сказала яна, што 100 мільёнаў злотых дапамогі ў рамках пашырэння парку ўжо гарантаваныя, а што тычыцца апошніх сродкаў, дык у гэтай справе вядуцца яшчэ размовы. Экалагічнае і прыродазнаўчае асяроддзе покі яшчэ не выказалася адназначна як ацэньвае новы праект пашырэння парку. Аднак паяўляюцца паасобныя выказванні прадстаўнікоў гэтага асяроддзя, што трэба пабольшаць парк на ўсю Белавежскую пушчу. Асцярожна наконт прапановы пашырэння парку выказваюцца звычайныя жыхары Белавежы, асабліва тыя, якія выхаваліся ў гэтай мясцовасці з дзяцінства.

— Зараз вельмі прыгнечаныя працаўнікі Белавежскага надлясніцтва, якія апасаюцца, што могуць застацца без працы. Калі б міністр асяроддзя спаткаўся з імі і даў абяцанне, што знойдуць яны работу ў Белавежскім парку, можа і яны падтрымалі б ідэю пашырэння парку, паколькі цяпер прыбытак ад продажу драўніны ў Белавежскім надлясніцтве невялікі і зарплаты працаўнікоў меншыя, чым раней. Звычайныя людзі таксама не мелі магчымасці паразмаўляць з міністрам, а таму, што гаворыцца або пішацца ў масмедыях, жыхары Белавежы не давяраюць. Ужо і раней пашыралі парк і абяцалі дапамогу. Пасля памяняўся ўрад і мала атрымалася з гэтых абяцанняў. Нашы людзі яшчэ апасаюцца ці сапраўды будзе можна загатаўляць дровы ў парку. Таму і патрэбныя непасрэдныя сустрэчы з мясцовымі жыхарамі і асабістае паабяцанне ім, што будуць маглі прывозіць з лесу дровы і збіраць грыбы і ягады, — сказаў Пётр з Белавежы.

У Белавежскай гміне апасаюцца таксама, што ў малой ступені пакарыстаюцца дапамогай з-за невялікага ўласнага бюджэту (гаворыцца, што гміны павінны дакласці прынамсі 15% уласных сродкаў у выпадку дафінансавання з Нацыянальнага фонду аховы асяроддзя). Большымі дапаможнымі сродкамі мог бы пакарыстацца горад Гайнаўка, на якога тэрыторыі таксама знаходзіцца Белавежская пушча (ад квартала Юдзянка ў напрамку звалкі смецця).

— Ужо прызначаны еўрасаюзныя сродкі на дафінансаванне будовы Прадпрыемства гаспадарання адкідамі ў Гайнаўцы і ўсё ідзе ў напрамку рэалізацыі гэтай інвестыцыі. Калі аднак гаварыць пра будову прадпрыемства, у якім адбывалася б утылізацыя смецця, якое застанецца пасля сартавання, дык гэта толькі прапанова, у якой няма яшчэ ніякіх рэальных кшталтаў. Паявілася магчымасць атрымання сродкаў на такую інвестыцыю, калі б была згода на пашырэнне парку, але покі нічога больш канкрэтна невядома на гэтую тэму, — сказаў Пётр Маркевіч, намеснік старшыні Рады горада Гайнаўка, выбраны ад Беларуска-народнага выбарчага камітэта. Ён быў згодны, што Гайнаўка сярод гмін Гайнаўскага павета мае самыя вялікія магчымасці, каб дакласці да ўспаможных сродкаў свае грошы і рэалізаваць праэкалагічныя інвестыцыі.

— Калі гаварыць аб прапанове пашырэння парку, я думаю, што цяжка будзе рашыцца радным з Белавежскай і Нараўчанскай гмін на такі крок. Аднак хутчэй, ці пазней і так ахова Белавежскай пушчы стане больш строгай, толькі застаецца пытанне, калі гэта будзе зроблена і якія карысці ад гэтага будзе мець мясцовае насельніцтва. Чарговы міністр асяроддзя можа ўжо не рашыцца даваць нам успамогу і ахова пушчы можа стаць намнога больш строгай, чым цяпер, а мы не атрымаем ніякай кампенсацыі пры такім рашэнні, — дадаў Пётр Маркевіч. Аднак у такіх катэгорыях радзей разважаюць жыхары самой Белавежы ці суседніх Пагарэльцаў, Тэрэмісак або Будаў, якія выхаваліся ў гэтых мясцовасцях з дзяцінства або жывуць тут здаўна. Калі я раней размаўляў з дзвюма жыхаркамі Пагарэльцаў, яны былі супраць пашырэння парку і моцна наракалі на лясную звярыну, якая наносіць шкоды ў гаспадарцы. Больш адкрытымі на пашырэнне парку з'яўляюцца прыезджыя.

— Наш парламент можа ж прыняць пастанову, якая не будзе ўжо патрабаваць згоды мясцовых самаўрадаў на павелічэнне парку або проста на тэрыторыі ўсёй Белавежскай пушчы, па-за паркам, могуць быць створаны запаведнікі, а для гэтага рашэння ўвогуле непатрэбная згода мясцовага насельніцтва, — лічыць мой суразмоўца-войт.

Я думаю, што покі зарана яшчэ гаварыць як пасля кансультацый з насельніцтвам і войтамі прагаласуюць радныя Белавежскай і Нараўчанскай гмін. Паколькі размовы з прадстаўнікамі Міністэрства асяроддзя яшчэ не закончыліся, сапраўды могуць паявіцца новыя канкрэтныя прапановы накіраваныя толькі ў дзве пушчанскія гміны. Надалей многа залежыць ад міністра асяроддзя і людзей, з якімі ён будзе кансультавацца ў справе магчымай дадатковай дапамогі для пушчанскіх гмін.

Лісіная праблема

Апошнім часам у вёскі салэцтва Бандары Міхалоўскай гміны пачалі заглядаць лісы. Іх можна напаткаць у Бандарах, Тайніцы-Гурнай і Рыбаках. Апошнюю вёску з аднаго боку акаляе агромны алешнік, у якім водзяцца дзікія качкі, курапаткі, салаўі і іншыя птушкі, а таксама сарны.

Калі паявіліся лісы, з алешніку не даносіцца ўжо кваканне качак, зніклі сарны і зайчыкі. Лісы ўсё, што напаткаюць, падбіраюць для свайго патомства. А лісоў кожны год становіцца ўсё больш і больш.

Пакуль гэтай небяспекай, якую стварае празмерная колькасць лісоў, ніхто сур'ёзна не займаецца. Улады Міхалоўскай гміны напэўна ведаюць, што лісы пагражаюць не толькі дзікай жывёле, але і хатнім птушкам ды сабакам. Можа здарыцца бяда, калі хворы шаленствам ліс пакусае сабаку ці хатнюю жывёлу, а тады будзе запозна прымаць прафілактычныя меры. На маю думку аб бяспецы людзей і жывёлы трэба клапаціцца раней, пакуль бяда як гром з яснага неба абрынецца на нашы галовы.

В. Б.

Акцыя аўтаінспекцыі

6 ліпеня ў Гайнаўцы праводзілася акцыя дарожнай паліцыі, якая зводзілася да напамінання карыстальнікам публічных дарог аб абавязку прышпільвання рамянёў бяспекі ў час язды. Арганізатарамі прафілактычнай акцыі былі Аддзяленне аўтаінспекцыі Ваяводскай камендатуры паліцыі ў Беластоку і Павятовай — у Гайнаўцы ды Ваяводскага асяродка дарожнага руху. У час акцыі, якая праводзілася па вуліцы 3 Мая, функцыянеры асаблівую ўвагу звярталі на паслядоўнасці, якія нясе за сабою непрышпільванне рамянёў бяспекі. На імітатары сутыкнення можна было праверыць што дзеецца з чалавекам у час дарожнай аварыі. Кожны, хто ўдзельнічаў у тэсце, згодна канстатаваў, што прышпільванне раманёў можа выратаваць жыццё.

Атракцыёнам былі спецыяльныя акуляры-маскі, якія паказвалі як бачыць чалавек, у якога ў крыві 1,5 праміля алкаголю. Хто пакарыстаўся прыборам, той уразіўся якасцю вобразу ў нецвярозага чалавека. Акулярамі-маскамі пакарысталася некалькі дзесяткаў чалавек, у асноўным шафёраў.

(ус)

Гайнаўка

Заслужаны кааператыў

Не ўсе пэўна ведаюць, што „Сполэм" Паўшэхная спулдзельня спажыўцоў (ПСС) у Гайнаўцы дзейнічае 86 гадоў! Заснавалі яе рабочыя мясцовай Хімічнай фабрыкі. Усё з мэтай, каб рабіць пакупкі танней чымсьці ў крамах, якія ў той час былі ў руках яўрэяў. Найбольшыя прыбыткі аб'яднаныя спажыўцы мелі тады ад продажу палатна і дражджэй.

А як працуе гайнаўскі кааператыў „Сполэм" цяпер? Мае ён 14 крамаў і пякарню. Гэтая апошняя пячэ м.інш. хлеб „Самое жыццё", „Сем зярнятак", „Хлеб маладосці" і іншыя хлебабулачныя вырабы.

(яц)

Чаго тут зайздросціць?

Тэкст і фота
Мацея ХАЛАДОЎСКАГА

Войты гмін, у якіх у пераважнай большасці або ў значнай частцы пражываюць беларусы, найчасцей апраўдваюць сваю непрысутнасць на ўрачыстасцях устанаўлення двухмоўных (польска-літоўскіх) указальнікаў мясцовасцей у гміне Пунск асабістымі прычынамі і службовымі абавязкамі. Адначасова шмат хто з іх адзначае: „Нашы жыхары яшчэ да ўвядзення падвойных назваў не даспелі".

Тыдзень таму пісалі мы аб пунскіх урачыстасцях, на якія войт Вітаўт Лішкоўскі, шляхам спецыяльна высланых лістоў, запрасіў з „беларускай" Беласточчыны галоўным чынам войтаў. Тады ў час размовы з „Нівай" здзіўляўся, нават крыўдаваў, што ні адзін з іх (або іхні прадстаўнік) не з'явіўся ў Пунск, хаця была гэта субота. Войты дзвюх, параўнальных з Пунскам па прыкмеце колькасці меншаснага насельніцтва, гмін — Чыжоў і Орлі — так тлумачылі ў размове з намі сваю непрысутнасць:

Войт Чыжоўскай гміны Юры Васілюк:

— Я быў непрысутны па асабістых, сямейных прычынах.

Войт Арлянскай гміны Пётр Сэльвесюк:

— Я быў у той час на пахаванні.

А вось тлумачэнні большасці іншых войтаў:

Раіса Раецкая (Бельск-Падляшскі): — Я нават была здзіўлена запрашэннем, пры ўсёй пашане для пана Лішкоўскага; я была ў Парцаве ў нядзелю на ўрачыстаці з нагоды ўзнікнення тут добраахвотнай пажарнай каманды. Дзень раней было ў мяне шмат працы звязанай з падрыхтоўкай да парцаўскага мерапрыемства.

Анатоль Паўлоўскі (войт гміны Дубічы-Царкоўныя) быў, як кажа моладзь, шчыры аж да болю: — Туды задалёка.

Мікалай Павільч (войт Нараўкі): — Адлегласць гэта не перашкода. У нас было ў той час Купалле.

Міхал Врублеўскі (войт Чаромхі): — Я ў рамках сацыяльнага фонду быў з працаўнікамі гміннай установы на экскурсіі ў Торуні і Цехацінку.

Вольга Рыгаровіч (войт Гайнаўскай гміны): — Я была на абучэнні ў Нядзіцы, але перапрашу пана войта Лішкоўскага. Вельмі яго цаню.

Якуб Садоўскі (войт Нарвы): — Наколькі памятаю, трапілася мне штосьці важнае (пыталіся мы ў яго пра гэта чатыры дні пасля ўрачыстаці ў Пунску — М. Х.).

Пры нагодзе размоў з войтамі дапытваліся мы таксама, ці не зайздросцяць пуншчанам двухмоўных назваў. Усе, як адзін, адказвалі:

— Нельга тут гаварыць аб зайздрасці.

Увядзенне падвойных назваў мясцовасцей залежыць ад ініцыятывы саміх жыхароў гмін або гмінных рад. Аб актуальнай сітуацыі адносна магчымага ўвядзення гэтых назваў і дапаможнай мовы ва ўстановах сваіх гмін нашы войты казалі так:

Юры Васілюк: — Падвойныя назвы гэта пытанне ангажаванасці жыхароў. Я пакуль такога зацікаўлення не бачу. Няма таксама ў нас пакуль такой волі з боку Гміннай рады. Я таксама ў сувязі з гэтым не намерваюся з такой ініцыятывай выступаць. Падвойныя назвы, мабыць, былі б разумным ходам дзеля турыстычнай прамоцыі. Можа, сёлета вырашым затое справу дапаможнай мовы ў Гміннай управе.

„Нашы" войты, дзе ж вы?

Пётр Сэльвесюк: — Не ўдасца вывесці людзей з маразму ў гэтай справе на працягу ледзь трох гадоў, ад калі я на гэтай пасадзе. Быў праект закону ў справе падвойных назваў, але сярод радных не было згоды наконт нюансаў звязаных з фанетычным гучаннем у лакальнай арлянскай гаворцы — ці пісаць яе „Во...", ці „О...". Калі гэты закон уступіць у сілу, цяжка сказаць. Прымем яго на першай сесіі Гміннай рады пасля канікул, але раней мусіць яе пракансультаваць спецыяльная камісія пры МУСіА.

Раіса Раецкая: — Мы ў прынцыпе маем ужо першыя двухмоўныя назвы. Моладзь са Звязу беларускай моладзі, у рамках праграмы „Дрэва і сакрум", паставіла ў нас двухмоўныя ўказальнікі. МУСіА пераслала нам прапановы змен дзвюх польскамоўных назваў. „Грыневічэ Дужэ" мелі б змяніцца на „Грыневічэ Вельке", а „Ожэховічэ" на „Орэховічэ". Аднак у справе падвойных назваў нашых мясцовасцей адмоўную рэкамендацыю выдала Гмінная рада. Затое дапаможнай мовай, без нейкага спецыяльнага ўвядзення, карыстаемся і так у гміннай управе заўсёды.

Анатоль Паўлоўскі: — Няма зацікаўлення ані радных, ані жыхароў і няма такой патрэбы. Ад 28 гадоў, як памятаю, ні адна заява не прыйшла ў гміну на беларускай мове. Беларускае гістарычнае таварыства запрапанавала змену назваў трох вёсак: Чахоў-Арлянскіх, Гурнага Груда і Круглага. Ані адзін з жыхароў не хацеў змены гэтых польскамоўных назваў, хоць у выпадку Круглага (Krągłe) увогуле невядома адкуль гэтая назва ўзялася. Здараецца, што людзі пішуць нам лацінкай, але па-свойму.

Мікалай Павільч: — Дапаможная мова ў нашай установе ўжо ўведзена ў рэгістры МУСіА і ўжо можна ёю карыстацца. Здавалася, найбольшае зацікаўленне падвойнай назвай магло б быць у Лешуках (Eliaszuki). Але ў час сустрэчы з жыхарамі на 30 асоб 27 прагаласавалі супраць. Людзі кажуць: „А нашто нам гэта". Лічаць, што дзяржаўная рацыя тут польская. Можа, з часам даспеюць да падвойных назваў.

Міхал Врублеўскі: — Нашы радныя дайшлі да вываду, што ў гэтай справе трэба пачакаць таго, як вырашаць іншыя. А з дапаможнай мовай, дык не трэба яе афіцыйнага ўвядзення, бо і так гаворым і пішам па-свойму.

Вольга Рыгаровіч: — Я паставіла гэтае пытанне на Радзе і ў час сустрэч з жыхарамі. Сказалі, што да гэтага мусяць даспець. Хочуць пачакаць, пакуль зменіцца ў Польшчы ментальнасць і адносіны да беларусаў і Беларусі. Не хочуць, каб людзі, праязджаючы праз нашы вёскі, бачылі беларускія назвы і сплёўвалі, бо беларушчына асацыявалася б ім з Лукашэнкам.

Якуб Садоўскі: — Мы, чыноўнікі, ад службы людзям. Трэба спытацца, ці людзі гэтага хочуць. Я лічу, што не хочуць. Над людзьмі трэба папрацаваць. Асабіста я не абавязваюся да такой ініцыятывы. Не магу сказаць, ці радныя будуць гэтай справай займацца.

Пры нагодзе выказвання войта Садоўскага варта прывесці яго думку, выказаную ў час сустрэчы з жыхарамі ў Трасцянцы (Trześcianka; у час кансультацыі ці жыхары хочуць вяртання назвы Трасцянка), якую запісала прысутная там наша журналістка: „Не будзе тут ніякіх зменаў, тым больш калі гаворка пра двухмоўныя назвы, бо я да гэтага не дапушчу".

У іншых гмінах, якіх войты ці бурмістры таксама былі запрошаны ў Пунск, тэма падвойных назваў „адтэрмінаваная". А ў Пунску не толькі ўвялі двухмоўныя назвы (у 30 салэцтвах з 33; у трох апошніх амаль поўнасцю пражываюць палякі) і дапаможную мову ў гмінную ўправу. У сталіцы гэтай гміны, налічваючай амаль чатыры з паловай тысячы жыхароў (74,4% ад агульнай колькасці насельніцтва складаюць літоўцы) працуюць дзіцячы садок і дзве школы (пачатковая і ліцэй з літоўскай мовай навучання), дзейнічаюць Літоўскі цэнтр народнай культуры (скансэн і музей) і Дом літоўскай культуры, працуюць крама з літоўскімі сувенірамі, тры рэстараны з літоўскай кухняй, чатыры галоўныя вуліцы носяць імёны звязаныя з літоўшчынай, шмат крам і паслуговых пунктаў маюць літоўскія назвы, а на працягу года агранізуецца пару дзесяткаў мерапрыемстваў звязаных з літоўскай традыцыяй, якія служаць падтрымліванню ўласнай культуры. Аднак, ёсць чаго ім зайздросціць!

Беларускі камень і бронза

Каля скульптуры Кацярыны Злоцінай

Тэкст і фота Міры ЛУКШЫ

„Гэта ўжо другая выстава з цыкла Мастацтва скульптуры нашых усходніх суседзяў, — сказаў вядомы мастак прафесар Анджэй Струміла, які прадставіў выбар найцікавейшых прац сярэдняга пакалення выдатных скульптараў з Беларусі ў Падляшскім музеі (ратуша) у Беластоку 10 ліпеня г.г. — Пасля выставы „Генерацыі", якая прадстаўляла віленскі клан Вілажунасаў на фоне старой літоўскай разьбы, з радасцю вітаю паказ беларускіх разьбяроў „Камень і бронза", сарганізаваны дзякуючы дапамозе Падляшскага музея і Музея разьбы імя А. Карнага ў Беластоку. Мастакі прадстаўляюць розныя індывідуальнасці і майстэрства. Спалучае іх шматгадовае супрацоўніцтва з Польшчай".

Прымаюць удзел у выставе васьмёра выдатных скульптараў сярэдняга пакалення з Мінска, Гродна і Магілёва — Віктар Копач, Андрэй Асташоў, Уладзімір Панцялееў, Уладзімір Піпін, Ганна Старавойтава, Андрэй Вараб'ёў, Ігар Засімовіч і Кацярына Злоціна. Куратарамі з'яўляюцца Зміцер Гарасімовіч і Анджэй Струміла.

— Мы ствараем у камені і метале, — кажа Зміцер Гарасімовіч. — Каб штось атрымалася, трэба сапраўды любіць гэты матэрыял. Нашы мастакі паказваюць іншым свой свет. Відаць таксама іхні патрыятызм. Экспазіцыя з'яўляецца чарговым крокам у развіцці беларускай скульптуры. Мастакі карыстаюць з еўрапейскіх трэндаў, усё ж захоўваючы нацыянальную традыцыю і майстэрства выконвання разьбы ў камені.

— Прэзентаваная тут выстаўка беларускай скульптуры сапраўдная рэдкасць і заслужаны поспех арганізатараў, — адзначыла мастацтвазнаўца Ірына Каломенская. — Айчынныя мастакі не часта маюць такую ўвагу ў галіне чыста культурніцкіх праектаў. Маем тут сапраўды ўнікальную магчымасць сабраць разам і адразу паказаць творчасць зусім розных скульптараў, якія плённа працуюць у станковай пластыцы не першае дзесяцігоддзе. У гэтых мастакоў за спінамі персанальныя экспазіцыі, узнагароды ды перамогі ў конкурсах, міжнародныя выстаўкі і пленэры. Іх творы знаходзяцца ў лепшых музеях Беларусі, прыватных і карпаратыўных калекцыях. Аздабляюць Мінск і іншыя гарады Беларусі і ўсталяваны за мяжой. Працы менавіта гэтых творцаў прэзентаваны ў галерэі невыпадкова. Яны валодаюць вельмі яскравым і пазнавальным творчым почыркам, стылістычна непадобныя адзін на адзнаго. Творчасць гэтых майстроў цікавая ў першую чаргу новай трактоўкай вобразаў, адсутнасцю налёту афіцыйнасці і пафасу, розняцца вобразнасцю вырашэння і пошукамі свабоднай пластыкі мовы. З надыходам гэтага пакалення беларускае разьбярства развіталася з адназначнасцю і былой пампезнасцю.

Кацярына Злоціна: — Для такога матэрыялу трэба мець сілу!

Уладзімір Панцялееў (нар. у 1957 г. у Навасёлках) — акадэмік разьбы. Лаўрэат узнагароды „За дасягненні ў галіне культуры і мастацтва", у 2002-2007 гг. старшыня Саюза мастакоў у Гродне. Меў выставы ў Беларусі, Расіі, Літве, Нямеччыне, Галандыі, Польшчы, Партугаліі, ЗША і Францыі. Удзельнічаў у пленэрах і сімпозіумах у Беларусі і Украіне.

Віктар Копач (нар. у 1970 г. у вёсцы Капачы), жыве і працуе ў Мінску. Удзельнічаў у 24 пленэрах у Беларусі, Расіі, Польшчы, Кітаі, Бразіліі, Нямеччыне, Іспаніі, В'етнаме, Турцыі. Прымаў удзел у больш за 30 выстаўках у Беларусі і за мяжой. Зрэалізаваў шмат скульптур у публічнай прасторы ў Беларусі, Кітаі, Бразіліі, Іспаніі і Польшчы. Атрымаў дыплом „China Olympic Park" у Пекіне (2006), першую ўзнагароду ў Конкурсе „Leonardo 2005" у Мінску і другую ўзнагароду на Сімпозіуме „Граніт" у Магілёве.

Андрэй Асташоў (нар. у 1970 г. у Лідзе) разьбярыць у камені, бронзе, рысуе, займаецца графікай. Меў больш за 50 персанальных і калектыўных выставак. Удзельнічаў у пленэрах у Беларусі, Расіі, Польшчы, Украіне, Літве, Францыі і Галандыі. Ягоныя працы знаходзяцца ў калекцыях у Беларусі, Расіі, ЗША, Нямеччыне, Іспаніі, Галандыі і Польшчы. Атрымаў узнагароду Міністра культуры РБ у 2005 г., дыпломы міністра культуры Польшчы, Акадэміі мастацтваў у Кракаве. Жыве і працуе ў Мінску.

Уладзімір Піпін (нар. у 1972 г. у Оршы), выкладчык скульптуры ў Беларускай акадэміі мастацтваў у Мінску. Удзельнічаў у многіх выставах і пленэрах у Беларусі і за мяжой. Працуе ў галіне станковай і манументальнай скульптуры. Жыве ў Мінску.

Ганна Старавойтава (нар. у 1982 г. у Мінску). Ад 2000 г. удзельнічае ў выставах і пленэрах у Беларусі і за мяжой. Працуе ў галіне станковай і садава-паркавай скульптуры.

Андрэй Вараб'ёў (нар. у 1969 г. у Магілёве), скульптар і выкладчык. Удзельнічаў у разьбярскіх пленэрах у Беларусі, Польшчы, Малдове, Францыі. Быў аніматарам шмат якіх мастацкіх акцый, выставак і галерэй, ініцыяваў арыгінальныя творчыя праграмы. Жыве і працуе ў Магілёве.

Ігар Засімовіч (нар. у 1966 у Мінску) удзельнічаў у пленэрах у Беларусі, Польшчы і Літве. Працуе ў галіне станковай і манументальнай разьбы. Працуе і жыве ў Мінску.

Працы **Кацярыны Злоцінай** (нар. у 1975 г. у Мінску) знаходзяцца ў прыватных калекцыях у Беларусі, Бельгіі, Канадзе і Польшчы.

— Маем у нашых працах адвольнасць, без межаў і стэрэатыпаў. Можам дазволіць сабе на ўсё, — кажа Кацярына Злоціна, па адукацыі лінгвістка, выкладчыца французскай мовы ў БДУ ў Мінску. — Такая вось цяпер беларуская скульптура. Мяне інспіруе прырода. На маіх работах паяўляюцца рыбы, кактусы, слімакі... Тут усё выканана ў камені, хоць займаюся яшчэ керамікай і разьбой у драўніне, як мой бацька. Практычна мастацтвам займаюся з маленства, але да гэтай цяжкай працы ў камені прыцягнуў мяне мой муж (Ігар Засімовіч), таксама разьбяр.

Выстаўка працягваецца да паловы жніўня 2009 года.

Часта мадэллю скульптур Ганны Старавойтавай з'яўляецца конь

Сумныя думкі

У сёлетнія дажджлівыя дні селянін сядзіць у хаце ды разважае як сабраць сена, каб забяспечыць на зіму корм жывёле. Калі я пішу гэты допіс (8 ліпеня), у шмат каго з сялян няма ні жменькі сена ў стадоле. Трава парасла ў пояс і старэе на пні. А як пры такім надвор'і сабраць збожжа з палёў?..

Другія сумныя думкі лезуць у галаву селяніну з-за таго, што наша ўлада закрывае добрыя прадпрыемствы па загадзе Еўрасаюза. Пераважна на „ўсходняй сцяне". Тут закрылі некалькі гадоў таму найлепшы і найбольшы ў краіне цукровы завод у Лапах. Працаваў ён без страт і выраблёў найлепшы цукар. Ліквідуюць Рамонтнае прадпрыемства чыгуначных вагонаў у гэтых самых Лапах. Людзі цэлымі сем'ямі становяцца беспрацоўнымі. Цяпер хоча ўлада прадаць у прыватныя рукі Беластоцкую фармацыю, і тут людзі баяцца, што страцяць працу. Найбольш даходныя прадпрыемствы адыходзяць у чужыя, заходнія рукі. Што будзе з людзьмі? Могуць перакваліфікавацца на цырульнікаў, кухараў і Бог ведае каго, толькі ці і ў такой прафесіі знойдуць яны працу? Ніхто з чалавекам не лічыцца ў гэтым дзікім капіталізме! Нават няма да каго пайсці паскардзіцца. А ведаеце, чаго цяпер апасаецца селянін? Што нашы ўлады пачнуць... прадаваць зямлю з вёскамі і людзьмі там пражываючымі замежным фермерам! А тутэйшыя людзі будуць наймацца на іхнія „ранчы". Можна тады абуць іх у ліпавыя лапці ды ў саматканыя кужальныя кашулі, і будуць яны такім вось атракцыёнам у „шматкультурным" запаведніку!

Мікалай ЛУК'ЯНЮК

Гуманны вадзіцель

Нядаўна, 30 чэрвеня, вяртаўся я з Бандароў у Гайнаўку на аўтобусе фірмы „Oktobus". Аўтобус адправіўся з прыпынку пунктуальна, у 19:27. Разам са мною вярталіся працаўніцы Дома сацыяльнай апекі ў Гарбарах. У той час неба зацягнула хмарамі, дзесьці над Белавежскай пушчай грымела і бліскала. Збіралася на вялікую буру.

Перад уездам у Гайнаўку выпаў дождж, вакол бліскалі маланкі. У аўтобусе засталося чатырох пасажыраў — я і трое працаўніц ДПС у Гарбарах. Раптоўна пацямнела, разбушавалася навальніца з маланкамі, здавалася, хмара абарвалася. Вуліцы раптоўна аказаліся пад вадой. Нам, пасажырам, стала страшна: як выйсці на вуліцу, якая пераўтварылася ў хуткацечны паток, як схавацца ад дажджу, як засцерагчыся ад маланак? Здавалася, становішча ў нас безвыходнае, пагражаючае здароўю, а нават жыццю.

І тут дапамог нам шафёр аўтобуса Сяргей Сапяжынскі. Пабачыўшы нашу бяду, вырашыў ён развезці нас па дамах. Мяне падвёз да магазіна „Бядронка" па вуліцы 3 Мая, каля якога стаіць мой жылы блёк. Я хуценька выскачыў з аўтобуса, а тут маланкі асляпляюць бесперапынна, і чым хутчэй дабраўся пад дашок магазіна. Тут я ўзрадаваўся, што я жывы, толькі адзенне трошкі прамокла.

Праз пасрэдніцтва „Нівы" ад імя свайго і астатніх пасажырак сардэчна дзякую вадзіцелю аўтобуса фірмы „Oktobus" Сяргею Сапяжынскаму за гуманнасць, за клапатлівыя адносіны да пасажыраў. Шырокай Табе, Сярожа, дарогі і ніякай бяды ў Тваім жыцці! Хай беражэ Цябе Бог!

Віктар БУРА

Ганна Кандрацюк (zorka@niva.iig.pl)

зорка

для дзяцей і моладзі

Кожны павінен шукаць свайго месца

Пётр Бароўскі, вядомы польскі рэжысёр, заснавальнік тэатра Studium Teatralne, быў госцем XXIII Сустрэч „Зоркі". Наш госць прыехаў у Ляўкова з праекцыяй фільма „Канец песні", галоўнымі героямі якога з'яўляюцца жыхары вёсак Сакольшчыны. Пётр Бароўскі пазнаёміўся з імі яшчэ ў 1980-я гады, калі разам з тэатральнай групай вандраваў па Беласточчыне і ставіў спектакль „Ужо адыходзім". Узамен людзі спявалі ім песні, якія наш субяседнік запісаў на магнітафонную плёнку. Пасля 27-мі гадоў Пётр Бароўскі вярнуўся ў тыя вёскі. Пад уплывам пабачанага ён стварыў фільм „Канец песні".

„Аранжавая хатка": — *Чаму якраз у 1980 годзе Вы вырашылі вандраваць са спектаклем па Сакольшчыне?*

— Я з дзіцячых гадоў хацеў падарожнічаць па свеце. Калісь не было ў мяне такіх магчымасцей, але мой бацька ўсвядоміў мяне, што ў першую чаргу я павінен пазнаць меншасці, якія жывуць у Польшчы.

— *Як Вы адчувалі сябе ў вёсках, дзе людзі між сабой не размаўлялі па-польску?*

— Мы разумеліся без слоў. Хаця я прыехаў з іншага свету, людзі прынялі мяне як свайго, яны дапамагалі наладзіць кантакты ў другіх вёсках. І хацелі падзяліцца ўсім, што самі мелі.

— *Ці пасля 27-мі гадоў вёска многа памянялася?*

— Яна зусім іншая, чым тады. Паводле мяне, гэта два розныя светы. Хаця цяпер людзі жывуць багата, не выглядаюць на шчаслівейшых. Вёскі пустыя, няма там маладых. Калісь усе любілі супольныя бяседы, любілі спяваць і танчыць. А цяпер амаль цэлы вольны час людзі глядзяць тэлевізар.

— *Паводле Вас, чалавек павінен мець зацікаўленні?*

— Думаю, што самае важнае ў жыцці займацца тым, што цябе цікавіць. Я выбраў тэатр, нехта іншы выбярэ матэматыку. Для кожнага з нас адведзена нейкая роля ў грамадстве. Мой настаўнік з пачатковай школы гаварыў, што заняткі і прафесіі людзей у многім напамінаюць табліцу мікраэлементаў Мендзялеева, у якой многа пустых месц. Яны праз нейкі час папаўняюцца. Так што кожны павінен шукаць свайго месца.

— *Ці потым Вы сустрэлі яшчэ такіх мудрых настаўнікаў?*

— Так. Самым важным сярод іх быў рэжысёр Ежы Гратоўскі. У маладым узросце я думаў стаць музыкантам. Дзякуючы Гратоўскаму, я займаюся тэатрам. Ён адкрыў мне вочы на тэатр і я пасля доўгіх пошукаў стварыў свой уласны тэатр Studium Teatralne.

— *Пастаноўкі, якія Вы рыхтуеце, вылучаюцца экспрэсіўным рухам і танцам. Хто навучае танцу Вашых акцёраў?*

— Яны самі ствараюць танцы. У такі спосаб можна праявіць сваю душу.

— *Ці Вы не думалі наведаць сённяшнюю Сакольшчыну са сваім тэатрам?*

— Мару аб гэтым, але баюся, што сучасныя жыхары вёсак не зразумеюць тэатральных пастановак.

— *Чаму так думаеце?*

— За гэта адказныя тэлевізары і кампп'ютары. Раней людзі былі больш адкрытыя на тэатральныя формы. У адной з вёсак (людзі гэта ўспамінаюць у фільме) мы сустрэлі калектыў, які рыхтаваў пастаноўку „Гэроды". Іх захапленне і адчуванне тэатра цяжка мне з чым колечы іншым параўнаць! Наш паэтычны спектакль „Ужо адыходзім" людзі ўспрымалі поўнасцю, убіралі яго ў сябе. Пасля, каб аддзячыцца, яны спявалі нам свае песні. Гэта быў настолькі прыгожы і моцны спеў на галасы, што чалавек адчуваў сябе ў гэтым свеце касмічна шчаслівым.

Фота Ганны Кандрацюк

„Аранжавая хатка": Гутарку пад кірункам **Ганны Кандрацюк-Свярубскай** падрыхтавалі: ***Эля Коршак, Міхаліна Герасімюк, Тамаш Ляшкевіч, Габрыся Налівайка, Караль Лукша, Наталька Семянюк, Юстына Якімюк.*** Гутарку запісала і апрацавала ***Наталля Кандрацюк-Свярубская***

Міра ЛУКША

Нырэц з Нурца



Хвалько нырэц перад бусламі:
— Мы — птахі перад вамі.
Вы толькі тупаеце па балоце,
кучамі збіраецеся ў палёце,
а плаваць ды нырэць як мы —
зусім ані-ні-ні!
— Ты проста качка, не болей!
Хваліцца нырцам ужо даволі!
І хрыплае ваша „чук-чук" —
дык што гэта за такі гук?
І абод вам на шыю хто даў?
Прэсных ты вод мараплаў!
Нырэц апусціў свой хвасток
і шпарка паплыў пад масток,
ды не таму паспяшаў,
буслам быццам рацыю даў,
а хацеў усім паказаць
які майстар ён паныраць!
А жонка ў маленькім гняздзе
глядзела, як на вадзе
трымаць гонар усіх нырцоў
яе майстар спорту гатоў.

Адукацыя і фільм

Фота Марка Уладзіміраа

Фота Марка Уладзіміраа

Фільмавыя майстар-класы ў арлянскай школе праходзілі ў днях 6-11 ліпеня г.г. Заняткі са школьнікамі вялі Марк Уладзіміраў і Ірэнэуш Пракапюк з Таварыства фільмавай адукацыі ў Бельску-Падляшскім. У занятках прыняло ўдзел восем арлянскіх школьнікаў. Моладзь узяла інтэрв'ю ў разьбяра Уладзіміра Войны, старшыні Рады гміны Аляксандра Кліна, дырэктар Дома культуры Анны Несцярук. Удзельнікі правялі таксама гутарку з рукадзельніцай з Рудутаў Зояй Майстровіч і старшынёй гміннай пажарнай каманды Міраславам Бало. Сабраны матэрыял пасля апрацоўкі стане інфармацыйным рапартам аб актуальных і будучых справах у гміне. Майстар-класы арганізавала Таварыства сяброў Арлянскай зямлі на сродкі Маршалкоўскай управы ў Беластоку.

Фота Марка Уладзіміраа

ГІСТОРЫЯ ПРА ХІМІЧНУЮ РЭАКЦЫЮ КАХАННЯ

Было тое, калі ваш дзядзечка захапіўся рознымі медычнымі, анатамічнымі ды рознымі хімічнымі штучкамі. Падчас іх вывучэння яшчэ і пісаліся розныя гісторыі пра вас, мае даражэнькія. Адна з іх — цяпер перад вамі.

Карацей, якраз у той час, калі мой цікаўны розум дабраўся да такой звышскладанай і невымерна цікавай рэчы, як чалавечы мозг, да мяне завітаў Крыштусь ды з глыбакадумным выглядам заўважыў:

— Гэта праўда, што нашы пачуцці — толькі вынік розных хімічных рэакцый у мозгу, ці не так?

— А калі так?

— Калі так, дык ці можаце вы зрабіць які вопыт — даць мне выпіць чаго ці з'есці?.. — каб... — тут голас ягоны крыху сцішваецца, — я закахаўся?

— Так, так... — слухаю яго далей.

— Разумееце, у маім мозгу куча розных рэакцый! — працягвае ўсхваляваны Крыштусь. — На чытанне, на футбол, на шпацыр, на гойданку на „тарзанцы", на мыццё посуду нават!.., а вось на каханне — няма, абсалютна...

— Кхм, кхм!.. — ужо хаваю звычаёвую ўсмешку ў сваіх вусах. — А не баішся?

— Чаго? — не разумее Крыштук.

— Пабочных наступстваў. Разумееш, каханне — гэта вельмі моцная хімічная рэакцыя. І ў яе могуць быць самыя нечаканыя пабочныя наступствы. Прычым іншым разам — абсалютна непрадказальныя.

— Балючыя? — у Крыштусёвых вачах ужо бачыцца лёгкі сполах.

— Па-рознаму. Але, калі ўжо баліць, дык баліць так, што ўсё іншае — лёгкія камарыныя ўкусы.

Нічога не адказвае на тое Крыштусь. А потым, крыху памаўчаўшы, проста выходзіць...

.....

Ён прыйшоў да мяне праз тыдзень. Ён прыйшоў, несучы ў руках сваё пругкае, жывое, рытмічна пульсуючае сэрца. Сэрца, якое было ўсё зрэзанае, сколатае, у страшных ранах, прабітае навылёт шыпамі, сціснутае калючым дротам. Сэрца, аблітае, залітае крывёю, сэрца, якое пырскала той крывёю навокал ад кожнага ўдару.

Я зірнуў ў вочы Крыштуся, каб убачыць там боль і пакуты, аднак... Вочы хлопца — смяяліся. Смяяліся шчыра, шчасліва, па-добраму і... Ён болей нават і блізка не ўспамінаў пра мозг ды розныя хімічныя рэакцыі. І яшчэ — зусім не я, зусім не акаляючае асяроддзе — адбівалася ў юначых вачах.

Здаецца, днямі, зусім выпадкова, — я бачыў гэтую дзяўчынку.

Ваш Дзядзечка Сід

13 ліпеня 2009 г., Кобрын



Міра ЛУКША

Фазан з Фастаў

Нафуфырыўся Філон,
фастаўскі франт-фармазон.
Фанабэрысты, файнясты!..
Як такі і выбраў Фасты?
— Я харошы і хвастаты.
Фешэнебельная хата
ў мяне ў хвашчы на ўзлеску!
І адсвечваю да блеску! —
форсіць фарбай апярэння,
металічнымі адценнямі.
Фазанова жонка Фэля —
шэранькая ж і ў нядзелю,
мала што аб хату дбае,
дваццаць дзетак апранае,
корміць, мые і люляе,
сама ж на ўсё зарабляе...
Не бярэ ж у мазгі Філон,
што не самы-самы ён,
што хоць вельмі ён харошы,
на жыццё ж патрэбны грошы,
і на хату, і на хворс.
Ой, Філон! Каб ты дарос!

Польска-беларуская крыжаванка № 30

Запоўніце клеткі беларускімі словамі. Адказы, з наклееным кантрольным талонам, на працягу трох тыдняў дашліце ў „Зорку". Тут разыграем цікавыя ўзнагароды.

Адказ на крыжаванку № 24:

Сям'я, фен, лімон, лета, Ас, пара, моц, рысь. Бал, сіла, мера, фота, сена, мы, Лаос, якасць.



Над Бугам

Тэкст і фота Аляксандра ВЯРБІЦКАГА

У Малую Турну заязджаю ў дождж. Дождж памяркоўны, дык і я не спяшаюся хавацца ад яго. Але спадар Матысюк чакае мяне на дажджы перад сваёй хатай, вітаемся ў брамцы. Заходзім дахаты, а там яшчэ і сусед, спадар Лучко, і спадара Матысюка сястра, якая пакінула родную вёску пяцьдзесят тры гады таму назад і цяпер прыехала пабачыць роднае гняздзечка.

Спадар Матысюк клікаў мяне да сябе, каб расказаць пра тамашнія ваенныя падзеі, аднак мяне найперш цікавіць мост на Бугу, што зараз за вёскай, як яго будавалі. Бо на даваенных картах моста каля Малой Турны не было...

Паром

— У міжваенны перыяд з Турны на другі бераг перапраўляліся паромам, — расказвае спадар Матысюк, — быў ён насупраць Вялікай Турны. Уласнікі парома былі з Козак, што за Бугам — Ваўрынюк і Тамашук. Яны плацілі нашым сялянам за арэнду даезду да парома праз нашы палі. Мой тата быў тады солтысам і рашыў, што за выручаныя такім чынам грошы трэба пабудаваць у Малой Турне студні, бо тады іх у вёсцы не было — ваду бралі проста з Камёнкі. Але летам вада ў рэчцы награвалася і студня была патрэбная. Сяляне купілі кругі ад Лукашэвіча са Станцыі, які рабіў таксама чарапіцу, і выкапалі дзве студні. І ланцугі купілі, і ручкі. За грошы ад згаданай арэнды вяскоўцы купілі таксама дзесятковую вагу, бо ж часта трэба было нейкую жывёлу зважыць калі хто прадаваў. Калі ў 1940 годзе саветы выселілі Малую Турну, то некаторыя сяляне выцягнулі некалькі кругоў, што наверсе былі, а апошнія засыпалі разам з тымі студнямі. Пазней, пасля вайны, калі людзі вярнуліся ў вёску, кожны гаспадар сам капаў сабе студню.

Насып пад дарогу — ад вёскі да моста — быў навезены яшчэ ў царскі час, бо тады тут мост быў, драўляны, ваенны. Калі рускае войска адступала перад немцамі ў 1915 годзе, казакі той драўляны мост спалілі. Пры санацыі моста не было, але рыхтаваліся яго тут пабудаваць. Былі ўжо навезены камяні для брукавання дарогі да моста — ад цяперашняга ронда, дзе разыходзяцца дарогі з Сямятыч у напрамку Любліна, Варшавы і Мельніка, да вёскі; на гэтым адрэзку насып ужо быў. Калі прыйшлі саветы...

Аднаго з Турны вызначылі на экскурсію ў Маскву, пабачыць новую сталіцу. Зайшлі ў магазін, там каўбаса вісіць... То захацелі нашы дэлегаты купіць крыху тае каўбасы, пасмакаваць таго маскоўскага прысмаку. Але не атрымалася, бо не каўбаса гэта была, толькі каўбасы бутафорыя, выкананая з драўніны.

Застава

Калі прыйшлі саветы, то камяні, што палякі прызначылі для маставой да моста, яны забралі і з іх залілі падмурак пад пагранічную заставу, якую яны пабудавалі ў Малой Турне. Навесну 1940 года сталі рыхтаваць драўніну. Прывезлі цесляроў з усходу, бо будынак меў быць з круглякоў; нашых таксама бралі да работы.

Я гэтых работ дакладна не бачыў, бо тут саветы вызначылі пагранічную зону ў 800 метраў і з яе ўсіх высялілі, значыць усю нашу вёску Малую Турну. І тут будавалі тую сваю камендатуру, а да часу яе здачы ў строй у 1940 годзе, камендатура з прыходу саветаў у 1939 годзе размяшчалася там, дзе цяпер ронда. Як мы раскідвалі свае збудаванні, то мне, як хлапчуку, выпала здзіранне стрэх. А перасялілі нас у маёнтак Конты, што каля Дзядковіч. Але неўзабаве перабраліся мы жыць да цёткі, якая сваю хату перанесла зараз за згаданую зону, каля Вялікай Турны; тата выхадайнічаў дазвол вярнуцца сюды. Пагранічнікі заходзілі да нас пасядзець, калі недалёка ладзілі свае вучэнні.

22 чэрвеня 1941 года дзень быў сонечны, з кучавымі аблокамі. Нямецкія самалёты ляцелі на Далубова, тамашні аэрадром бамбіць. Наша сям'я хавалася ў ямах для бульбы. Начальнік заставы, Калужын, хадзіў каля Вялікай Турны, па ім немцы з-за рэчкі Камёнкі адкрылі агонь. Ён упаў і поўз у Вялікую Турну, падзер локці ў рукавах гімнасцёркі ды калені ў нагавіцах. І прасіў у Вялікай Турне каня, каб жонку з дзяцьмі з заставы забраць. Але каня не атрымаў, бо ўсе коні былі ноччу на пашы і калі пачалася вайна, то ніхто іх з пашы не забіраў.

Ян Матысюк

Аляксандр Лучко

Па сем'і пагранічнікаў у Малую Турну прыехаў з Сямятыч самаход і забраў іх у напрамку Ваўкавыска; пра гэта расказала пасля адна жыхарка Слохаў, якая была служанкай на заставе. Тыя сем'і перагрузілі з самахода на поезд недзе далей — у Чаромсе або Гайнаўцы. У Калужыных было двое дзяцей, блізнят, адно з іх прапала. І сам Калужын недзе прапаў. Але на заставе ніхто з пагранічнікаў не загінуў, нават будынка немцы не пашкодзілі.

Неўзабаве заставу занялі немцы. Будынак перабудавалі яўрэі, з вялікіх залаў зрабілі адна- і двухмесныя пакоі, абсталявалі туалеты, кухню. А ўжо насельніцтва Вулькі і абедзвюх Турнаў зганялі, каб акопы ад партызан капаць. Калі капалі акопы, то выкапалі дыскі да кулямётаў Дзегцярова, якія перад адступленнем былі закапалі савецкія пагранічнікі.

У перабудаванай заставе немцы размясцілі сваю заставу, якую перанеслі з Біндугі, з супрацьлеглага берага Буга. Бо на Бугу зноў стала граніца, на гэты раз паміж Генеральным Губернатарствам і Беластоцкай акругай, якая была далучана да Усходняй Прусіі, да Рэйха.

Па абодвух баках Буга дзейнічалі розныя нямецкія законы. З нашага боку не было крамаў з прамысловымі вырабамі, але можна было садзіць махорку. А ў Генеральным Губернатарстве было інакш, і адтуль пераходзіла кантрабанда цераз Буг; да нас яны прыходзілі па махорку, масла, мяса.

Так было да чэрвеня 1944 года, калі немцы на фурманках уцяклі на захад. З навакольных вёсак узялі трыцаць падвод, на якіх завезлі немцаў недзе пад Пултуск. Там нашы коней прадалі і на адной фурманцы вярнуліся; з фронтам яны мінуліся недалёка за Бугам, у Дражневе. Вярталіся на адной фурманцы, бо нямнога даехала да Пултуска, шмат вазакоў уцякло з транспарту па дарозе.

Пасля вайны будынак заставы разабралі і бярвенні ад яго перавезлі ў Клапоты-Буйны, што за Чартаевам, і там скарысталі для пабудовы школы, бо тадышні сямятыцкі войт менавіта з Буйнаў быў.

Бой у Слохах

— Пра першыя дні вайны ў Слохах-Аннапольскіх расказаў Аляксандр Лучко. Пачаў з верша: „Мы вспомним ребята победу/ Про сорок, о, первой мы год/ Как немец к нам стал придираться/ И нищил невинной народ /Он двацаць второго он июля/ Нагрянул советам войну/ Часа в два весенное ночи/ Нарушил ночну тишину/ Германские пушки запели/ Германские танки гремят/ Советски бойцы той спохвиля/ Спокойно в квартирах и спят/ Бедняги рано собралися в кучу/ И стали вопросы решать/ Припасы по точкам раздали/ Засели страну сохранять/ Эти точки сооруженные были/ Первая линия семятыцкой район/ По шосе они прямо стреляли/ По той что германец ишёл/ Але немецкий майор не зважал на это/ Машину во всю скорость пустил/ Хотел он проехать шосой этой/ До Бреста с приказом спешил/ Але немецкому майору случилась невдача/ Советский боец не струсил/ Машину сдержал эркаэмом/ В побеге майора убил/ Але немцы то всё надзирали/ Же майор был в деревне убит/ Злобы того духа набрали/ И стали деревню палить/ Сараи, дома зажигали/ Людей нагоняли в огонь/ Мы страсти такой не видали/ Как немец нам сделал удар/ Понищил невинные люди/ Он прямо в огонь нагонял".

— Хто склаў гэты верш? — цікаўлюся.

— Ян Карпюк, які служыў у міліцыі, меў званне маёра, і я — разам склалі гэты верш.

У цыкле рэпартажаў „Буг у агні" пра баі каля Слохаў-Аннапольскіх Віктар Рудчык пісаў і пра гэты верш („Ніва №№ 4-6 ад 1980 года), але было там толькі пра аўтарства Яна Карпюка. Аднак змест верша, які быў прывёў тады спадар Рудчык, быў іншы ад пачутага мною, хаця яго пачатак і агульны рытм у абодвух творах аднолькавыя. Значыць, пра змаганне савецкіх байцоў, з якімі жыхары Слохаў зжыліся за некалькі даваенных месяцаў, мясцовыя, хто як умеў, сталі складаць творы і разбудоўваць ужо існуючыя. Такім чынам узніклі розныя версіі аднаго і таго ж верша, першапачынальнікам якога быў, без сумненняў, Ян Карпюк. А іншыя аўтары, так як старажытнаперсідскія паэты, асвятлялі тую тэму кожны на свой лад...

— Салдаты стаялі па-суседску з намі і я іх усіх знаў, — прадаўжаў расказ спадар Лучко. — Часць з іх загінула ў баі, а тых, што не здаваліся, немец атруціў у точках. Па тых точках мы пасля хадзілі і ружжо забіралі, як асталося. Былі пісталеты, карабіны, ручныя кулямёты. Бо немцы толькі цяжкія кулямёты забралі, а ў точкі не лезлі, бо там смурод ад трупаў ужо быў. А мы жывёлу пасвілі і туды заходзілі.

Пасля немец жыдоў прыгнаў і яны тыя трупы выцягвалі і закопвалі каля кожнай точкі. Пасля немцы кідалі ў точкі гранаты, закладалі ўзрыўчаткі і вырывалі жалеза з амбразур. Канструкцыя моцная была, гарматы дзве з точак знялі і выцягнулі, але точак тых узарваць не ўдалося. У кожнай точцы студня была, адкуль ваду бралі піць і ствалы кулямётаў халадзіць.

У нас вартаўнічая рота стаяла і палітрук Локцеў даў байцам загад бараніцца. У адной точцы былі боепрыпасы і іх двойкай коней развозілі па іншых точках. Былі ў саветаў і мінамёты, але іх у баях не прымянілі.

Немцы з'явіліся з боку Крупіч, не па шашы ад Клекатава; яны Буг перайшлі недзе каля Франкапаля. Гэта было ў нядзелю, а яшчэ ў суботу кіно ў нас на смузе паказвалі, як саветы Фінляндыю бралі. Былі новыя ваякі, але сярод гледачоў былі і пераапранутыя немцы, і невядома было, хто кім быў. Тыя немцы гаварылі: „Утром ещё лучше фильм будет". І тэлефоны ноччу яны парвалі.

Быў старшына Гарэлаў, а яго жонка санітаркай была. І амаль кожны лейтэнант меў жонку. Калі ўспыхнулі баі, то тыя жонкі разам з намі пад Буг уцяклі; а Гарэлаву забралі ў точку.

У баях загінулі Белавусаў з Валагодскай губерні, Курацін, палітрук Локцеў, баец Грахоў, лейтэнант Шчаблякоў... У палон трапілі капітан Маліноўскі — урач, Гарэлаў з жонкай — жонку немцы зараз адпусцілі; Гарэлава забілі ў лагеры ў Сухажэбрах, калі прабаваў уцякаць. У палон трапіў лейтэнант Яськоў, які нямецкага маёра забіў; гаварыў ён: „Хорошую рыбу зловил, могу сам погибать". Яськоў у вайну працаваў у каменных кар'ерах, пасля вайны прыязджаў сюды. Трапіў у палон малодшы лейтэнант Шыбакоў з Масквы, і Плаксей. Пасля вайны Плаксей прыехаў у Слохі. Я тады акурат сена заграбаў, як ён прыйшоў:

— Здравствуй, Саша! — прывітаў ён мяне.

— Здравствуй.

— Что, не узнал?

— Не узнал

— Плаксей!

Салдаты бараніліся ў точцы, скончыліся боепрыпасы, пасходзілі ў падвал. Немец закрычаў: „Рус, здавайся!" А палітрук выкінуў навонкі ключы, каб ніхто з дота не вылез, не здаўся, каб усе пагінулі. Але немцы гранатамі выбілі дзверы і салдаты выйшлі. Апошнім выйшаў палітрук Локцеў. Ён, як палітрук, меў зорку на рукаве і яго немцы адразу штыкамі закалолі.

Салдацкіх жонак адправілі ў Бацікі. Тыя, што былі з Беларусі, выехалі яшчэ ў час вайны, а каму было далей, тыя асталіся тут да канца вайны.

(працяг будзе)

ТБК у беларускім Паазер'і

Тэкст і фота
Алеся АДАМКОВІЧА

4-5 ліпеня 2009 г. сябры Таварыства беларускай культуры ў Літве наведалі этнічную Бацькаўшчыну. Гэтым разам праехаліся па маршруце Вільня — Камаі — Паставы — Глыбокае — Мосар — Мядзел — Радкі — Вілейка — Забродзе — Жупраны — Вільня.

Першым месцам, якое мы наведалі, была вёска Камаі, знакамітая адным са старэйшых касцёлаў Яна Хрысціцеля, які за 400 год ніколі не спыняў сваёй дзейнасці. Унікальнасць гэтага храма яшчэ і ў тым, што ён калісьці выконваў абаронную функцыю. У ім служыў беларускі святар ксёндз Кастусь Стаповіч, вядомы як паэт Казімір Сваяк. Яму ў 2006 г. у сценах гэтай святыні была адчынена мемарыяльная шыльда. Тут быў ахрышчаны прафесар Браніслаў Руткоўскі, вядомы арганіст, дырыжор, педагог.

Паставы, якія мы наведалі наступнымі, у гэты дзень адзначалі сваё 600-годдзе. Магчыма таму мясцовыя краязнаўцы не змаглі нам удзяліць шмат часу, каб глыбей пазнаёміць з горадам, а распавялі толькі кароценька аб яго гісторыі і сучаснасці. А далей мы самастойна вандравалі вулачкамі старажытных Паставаў. Безумоўна, самым уражлівым было наведванне палаца Тызенгаўза. Нягледзячы на тое, што там зараз знаходзіцца бальніца, яшчэ можна ўявіць былую веліч палацава-паркавага ансамбля. Тым больш бачна, што праводзяцца працы па аднаўленні знешняга выгляду будынка. А ўнутры два пакоі прысвечаны мінуламу, там адноўленае былое іх убранства і прадстаўлена кароткая гісторыя Паставаў і роду Тызенгаўзаў. Тут варта адзначыць, што Канстанцін Тызенгаўз быў арнітолагам і сабраныя ім экспанаты сталі асновай арніталагічнай калекцыі Віленскага ўніверсітэта.

Паэт, гісторык, географ, краязнаўца, педагог Ігар Пракаповіч у сваім расповедзе аб Паставах акцэнтаваў нашу ўвагу на архітэктуры горада і спыніўся на такім моманце, як знішчэнне помнікаў архітэктуры ў савецкі час, калі на плошчы было шмат цікавых і старажытных забудоў, і якія проста знеслі, каб пабудаваць райвыканкам. Праўда, радуе такі момант, што пры пабудове новых дамоў улічваюцца архітэктурныя традыцыі мінулага.

Варта адзначыць, што Пастаўшчына дала Беларусі і свету шмат цікавых і выдатных асоб. Сярод іх — беларускі паэт Уладзімір Дубоўка.

У Глыбокім нас чакалі краязнаўцы Уладзімір Скрабатун і Кастусь Шыталь. Гісторыя горада і былога мястэчка цесна звязана з тымі трагічнымі падзеямі, што адбываліся на нашых землях. Глыбокае — былая вотчына Корсакаў, якія пакінулі найбольшы след у яго гісторыі. Найбольшага росквіту мястэчка дасягнула ў часы Рэчы Паспалітай і прыйшло ў занядбанне ў Расейскай Імперыі (дарэчы, як і ўся Беларусь). І сёння, у цэнтры, мы бачым два прыгожыя касцёлы, якія нагадваюць аб тых велічных падзеях, што калісьці тут адбываліся. Не захаваўся трэці касцёл у Беразвеччы (былая ўніяцкая царква з кляштарам айцоў базыльянаў), не захавалася ў самім Глыбокім і ўніяцкая царква.

Цікавым было наведванне былога кармеліцкага касцёла і кляштара. У яго скляпеннях яшчэ хаваецца шмат таямніцаў. Калісьці там спачываў яго фундатар — Корсак. Да гэтага часу так і невядома, у якім месцы ён быў перазахаваны. І зараз там знаходзяць шмат трунаў, чалавечых астанкаў. На жаль, дзяржава так і не змагла да гэтага часу правесці раскопкі, даследаваць падземныя кляштарныя лабірынты і раскрыць таямніцы мінулых дзён мястэчка.

Кляштар, як і Глыбокае, памятаюць імператара Францыі Напалеона Банапарта, які спыняўся тут у час свайго паходу на Маскву. Па адных звестках, ён прабыў у іх 7 дзён, па іншых — 10. Сцены памятаюць і енкі паўстанцаў 1863-1864 гг., якіх тут дапытваў сам Мураўёў.

На сённяшні ж дзень кляштар у разбураным стане. Ад будынка захавалася толькі адна сцяна і фрагменты агароджы, што нагадваюць аб слаўных старонках мінулага Глыбокага.

Глыбокае вядомае і сваімі знакамітымі асобамі. Тут нарадзіўся палітычны дзеяч Клаўдзій Дуж-Душэўскі, знакаміты аваіяканструктар Павел Сухі, з ваколіц Глыбокага паходзіць Вацлаў Ластоўскі, польскі пісьменнік Тадэвуш Далэнга-Мастовіч, у памяць якога ў горадзе ўсталявана мемарыяльная шыльда. На могілках спачывае вядомы беларускі ксёндз Антон Зянкевіч, які стаяў ля вытокаў беларусізацыі касцёла на Віленшчыне ў 1920-1930 гг. і прымаў у ёй актыўны ўдзел, за што меў шмат нападак з боку польскага шавіністычнага каталіцкага духавенства. Да прыкладу, адна цытата з кнігі каноніка Бародзіча:

*Калі ўваскросла Польшча, немцы ламалі галаву, каб убіць ёй такі клін, які змог бы яе расшчапіць. Змаглі паўплываць на Рым, а таксама на Літву, каб на польскіх крэсах завесці рускую ўнію. Апекуном такой уніі стаў біскуп Матулевіч, які з гэтай мэтай перацягнуў пад Друю вядомых рускіх агітатараў і шавіністаў, якія хочуць выгнаць польскасць з нашых крэсаў. Асабліва ў гэтым плане актыўна працуюць кс. Бобіч — Міёрскі дэкан, **А. Зянкевіч — Глыбоцкі дэкан**, А. Станкевіч — пасол у сойм у Вільні, В. Гадлеўскі з Жодзішак, Шутовіч з Барадзеніч і інш. Яны стварылі рэдакцыю „Беларускай крыніцы" і інш., перавялі і выдалі для народа шмат кніг, асабліва Бобіч, Станкевіч і **Зянкевіч**, заклалі пры кляштары ў Друі гімназію Сцяпана Баторыя. І ўся гэтая „суполка" пачала пераварочваць палякаў на беларусаў і ўніяцкі абрад.*

Яшчэ і сёння, блукаючы вулачкамі гэтага старажытнага, практычна зруйнаванага мястэчка, можна ўбачыць шмат слядоў слаўнага мінулага.

У чарговы раз наведалі мы і „беларускі Версаль" — касцёл св. Ганны ў Мосары. Кожны раз уражваюць прыгажосць і добраўпарадкаванасць касцёльнай тэрыторыі, колькасць наведвальнікаў.

Пераначаваць мы спыніліся ў Мядзелі, дзе нас гасцінна прыняла Крыстына Балаховіч у доме сваёй маці. Тут адбылася сустрэча з журналістам і краязнаўцам Алесем Высоцкім. У час вячэры абмяркоўвалі мы планы на наступны дзень і дзяліліся сваімі ўражаннямі ад першага дня вандроўкі. А начаваць нас гасцінна прыняла спадарыня Ала ў сваім доме, за што ёй выказваем шчырае дзякуй.

Сваім святым абавязкам палічылі мы наведванне магілы Валерыя Місюка, намесніка старшыні ТБК, які трагічна загінуў 19 ліпеня мінулага года на свой дзень народзін. Заехалі і ў вёску, дзе жыве яго бабуля і дзе два гады таму Валера нас гасцінна прымаў у час адной з вандровак па Мядзельшчыне. Бабуля Валеры, спадарыня Ніна, прыняла нас надзвычай гасцінна, была вельмі ўзрадаваная нашаму прыезду, увесь час распавядала аб сваім найвялікшым горы — страце ўнука Валерыя. Уражвае жвавасць гэтае 84-гадовае жанчыны і яе светлы розум і памяць. Яна яшчэ рупіцца на гаспадарцы і працягвае жыць, помнячы Валеру. Пакуль ёсць памяць — чалавек жыве, кажуць мудрыя. Таму, пакуль мы памятаем нашага сябру, ён з намі жывы, побач. А на яго магілу нарвалі кветак з яго родных палёў, па якіх ён калісьці бегаў, будучы хлапчуком. Няхай у яго вечным сне яны нагадваюць аб каранях, аб дзяцінстве і няхай сніцца яго Беларусь, вечная, незалежная, дэмакратычная...

Не пакінула нас раўнадушнымі і наведванне Вілейкі. Думаю, у памяці ўсіх застанецца знаёмства з краязнаўцам, архітэктарам, мастаком Анатолем Капцюгом. І тут хочацца выказаць падзяку Алесю Высоцкаму, які нас звязаў з гэтым цікавым чалавекам.

Анатоль чакаў нас у краязнаўчым музеі, дзе і распавёў аб гісторыі Вілейкі з часоў глыбокай старажытнасці каменнага веку да нашых дзён. Створаныя ім кампазіцыі дапаўнялі яго аповеды і дапамагалі нам вандраваць па старонках прабеглых дзён. І тут таксама шмат слаўных момантаў. З Вілейкі распачалася знакамітая экспедыцыя па Віліі графа Тышкевіча. Тут уладарылі Сапегі, Радзівілы, Пацы, Тышкевічы... Тут нарадзілася шмат людзей, што пакінулі глыбокі след у гісторыі Беларусі.

На Вілейшчыне нарадзіўся і быў расстраляны адзін з найвялікшых патрыётаў Бацькаўшчыны — Расціслаў Лапіцкі. Адсюль паходзіць Язэп Малецкі. Адсюль карані Ігната Дамейкі.

Самым цікавым і ў той жа час балючым момантам было наведванне адзінага ў свеце мемарыяла Зніклых вёсак (архітэктар Анатоль Капцюг). Аўтар нам распавёў аб сваёй ідэі. У аснове — малекула ДНК, іншымі словамі, аснова жыцця. І паабапал яе камяні са спісамі неіснуючых вёсак. На заднім плане вёска-прывід і студня-журавель, як напамін аб былых вёсках. *Прыпыніся вандроўнік! Дакраніся рукою і сэрцам да гэтых камянёў. І няхай твая душа напоўніцца любоўю да роднай вёскі, роднай сядзібы і хаты, якія знёс бязлітасным подыхам няўмольны час. Няхай заўсёды будуць з табой пачуццё нашчадка сваіх блізкіх і далёкіх продкаў, адчуванне сваіх каранёў, Бацькаўшчыны,* — гаворыць надпіс на маўклівым камяні. І ведаеш, што гэтыя вёскі ўжо больш ніколі не адновяцца, не пачуеш у іх ні людской гамонкі, ні звону касы ў ранішняй расе, ні спеву пеўняў на ўзыходзячым сонцы...

У вёсцы Забродзе мы наведаліся ў госці да Барыса Цітовіча, які займаецца ўвекавечваннем памяці ахвяр Першай сусветнай вайны. Вядома, што тут, на Вілейшчыне, тады стаяў фронт, ішлі жорсткія баі. І сёння засталося шмат пакінутых, знявечаных магіл загінуўшых салдат. Варта адзначыць, што калі гэты край апынуўся пад Польшчай, немцы прыводзілі ў парадак салдацкія пахаванні, у тым ліку і расейскіх салдат. А вось сама Расея не змагла дагледзіць нават сваіх. Так і ляжаць яны пакінутыя, забытыя. І нават за савецкім часам знішчалі не толькі нямецкія, але і свае пахаванні.

І вось чалавек-энтузіяст узяўся за аднаўленне месц апошняга адпачынку воінаў Першай сусветнай вайны. Знаходзяцца забытыя пахаванні, аднаўляюцца і за імі вядзецца дагляд. Але ў дадзены момант існуе іншая праблема. Гэта чорныя археолагі, якія, жадаючы разбагацець на мёртвых салдацкіх касцях, раскопваюць магілы і месцы, дзе вяліся баі, выкопваюць салдацкія жэтоны, медалі, пражкі, зброю і ўсё гэтае пасля прадаюць. Але з іншага боку чаму тут здзіўляцца. Іх выхавала тая імперыя, якая бурыла тыя ж пахаванні, на чалавечых касцях будавалі дамы, плошчы... І з тым знікала павага да чалавека, да яго памяці. Вось яны і ідуць слядамі той імперыі.

І апошнім нашым прапынкам сталі Жупраны — месца пахавання Францішка Багушэвіча.

У час вандроўкі мы зразумелі, што Беларусь вечная, яна па-за часам і па-за сістэмамі і ўладамі. Беларусь — гэта яе зямля і яе людзі. Глядзіш, як адзін чалавек можа шмат рабіць: захоўваць гісторыю і сляды свае зямлі, увекавечваць памяць былых пакаленняў, не зважаючы ні на якія сістэмы. Гэты беларус жыве і зберагае памяць, перадаючы нашчадкам галасы прабеглых дзён з тым, каб захаваць Беларусь.

Пяты з’езд беларусаў свету

Тэкст і фота Міры ЛУКШЫ

Чарговы з’езд беларусаў свету, сарганізаваны Міжнароднай грамадскай арганізацыяй Згуртаванне беларусаў свету „Бацькаўшчына”, праводзіўся 18 і 19 ліпеня г.г. у Мінску. Сабраў ён больш за 200 дэлегатаў з 18 краін. Прысутнічалі на ім замежныя дыпламаты, а таксама прадстаўнікі беларускай улады — упаўнаважаны па справах рэлігій і нацыянальнасцей Леанід Гуляка, прадстаўнікі парламента, міністэрстваў — замежных спраў, асветы і інфармацыі, а таксама нядаўна назначаны міністр культуры РБ Павел Латушка. Прыйшлося прадстаўнікам улады, на выдатнай беларускай мове, не толькі вітаць сабраных прадстаўнікоў беларушчыны з усяго свету, але і адказваць на і за пытанні наконт беларушчыны ў Беларусі. На з’ездзе было абрана новае кіраўніцтва МГА ЗБС „Бацькаўшчына”, якое ўзначаліла Алена Макоўская, замяніўшы на гэтай пасадзе Аляксея Марачкіна. Выбрана была таксама Вялікая Рада аб’яднання, у якую ўвайшлі 53 прадстаўнікі беларусаў замежжа (м.інш. Лена Глагоўская, Яўген Вапа і Міхась Андрасюк з Беласточчыны) і 47 прадстаўнікоў Беларусі (з іх была сфармавана Малая рада).

Пяты з’езд беларусаў свету працаваў у міжнародным адукацыйным цэнтры, хоць былі зноў традыцыйныя непаладкі з вызначэннем месца для правядзення гэтага прэстыжнага для Беларусі мерапрыемства.

Міністр культуры пералічыў дакладны спісак дасягненняў дзяржавы ў галіне адраджэння нацыянальнай культуры. Падагуліў:

— Важна што разумеем, што мы павінны працаваць разам на захаванне беларускай культуры і дзяржаўнасці, — звярнуўся ў сваім дакладзе-справаздачы-вітанні. — Нам часта даводзіцца чуць, што мы тут, на Беларусі, мала што робім для гэтага. Але насамрэч шмат што робіцца, хаця, магчыма, магло б быць больш і больш.

Да міністра культуры, які два дні прысутнічаў на абрадах, выступоўцы звярталіся з прапановамі, абвінавачаннямі, таксама словамі пачуцця гонару ад яго беларушчыны і надзеяй на тое, што такія дзяржаўныя дзеячы як Павел Латушка ўчыняць шмат для таго, каб дзяржава, яе культура і мова занялі пачэсны пасад між народамі Еўропы. Іншую думку выказаў былы старшыня Аляксей Марачкін: „Сённяшняя палітыка дзяржавы вядзе да страты беларускай культуры і суверэнітэту”.

Больш пра з’езд МГА ЗБС „Бацькаўшчына” — у наступным нумары „Нівы”.

Галерэя віртуальная арт Haliota

Што ні кажыце, але бывае вельмі прыемна, шпацыруючы па горадзе, заблукаць на вернісаж. Вулічныя мастакі — гэта як нейкая неад’емная частка горада. Без іх горад выглядае папросту нейкай шклобетоннай забудовай, дзе няма месца для адпачынку душы і ласкання погляду. Амаль тое ж самае можна сказаць пра інтэрнэт — калі б у ім не было месца для выяўлення карцін і малюнкаў, то ён так і заставаўся б сродкам для перадачы літар і лічбаў на вайсковыя патрэбы. На шчасце, віртуальная рэчаіснасць мае больш прывабную афарбоўку. Амаль такую ж, якую можна сустрэць, зазірнуўшы ў інтэрнэт-галерэю Haliota.

Віртуальны вернісаж месціцца па адрасе **www.haliota.com**. Першая яго старонка выглядае даволі просценька — з левага боку выяўленне карціны мастака Арунаса Урнежыса, пасярэдзіне — напісаныя прозвішчы мастакоў, якія адначасова з’яўляюцца гіперспасылкамі на „іхнія” старонкі, а з правага боку — запрашэнне да наведвання арт-галерэі і яе невялікая прэзентацыя. „Запрашаем Вас наведаць віртуальныя выставы галерэі Haliota і прыняць удзел у стварэнні гэтага праекта, мэтай якога мы бачым знаёмства з аўтарамі сучаснага мастацтва, — пішуць аўтары сайта. — Вы можаце весці пошук па відах мастацтва: жывапіс, графіка, скульптура, фатаграфія, фларыстыка. У раздзеле „Падзеі” Вы можаце даведацца аб некаторых мінулых выставах у Менску, і можаце прапанаваць анонсы сваіх культурных мерапрыемстваў”.

Выйсці да рубрык сайта месцяцца ў двух месцах — зверху і ў тэксце-запрашэнні. Праўда, далёка не ўсе яны працуюць, што з’яўляецца, бадай, асноўным недахопам віртуальнага вернісажу. Так, нічога мы не ўбачым у „Графіцы”, „Скульптуры”, „Фларыстыцы”. Рубрыка „Падзеі” таксама з некаторага часу не працуе, бо, як паведамляецца, з-за „пераезду адміністрацыі”. Шчыра кажучы, нейкае не зусім зразумелае тлумачэнне, да таго ж распаўсюд інфармацыі аб мастацкіх падзеях з’яўляецца вельмі важным не столькі для віртуальных наведвальнікаў, колькі для мастакоў, якім, зразумела, залежыць на папулярызацыі сваёй творчасці.

Што ж тычыцца мастакоў, то пакуль з тых, хто прадставіў тут свае творы, на сайце прысутнічаюць Антон Гіро (фатаграфія), Георгій Ліхтаровіч (фатаграфія), Аляксей Мяснікоў (фатаграфія), Аляксей Паўлюць (фатаграфія) Аксана Санкоўская (фларыстыка), Анастасія Фецісава (жывапіс, графіка) і Рытас Юргеліс (жывапіс). Пра некаторых мастакоў, чые творы прадстаўлены на сайце, напісаны невялікія біяграфіі. Так, Аксана Санкоўская — фларыст-дэкаратар. Змешчаныя на сайце яе кампазіцыі з кветак уяўляюцца сапраўднымі архітэктурнымі збудаваннямі.

Фотамастацкія творы Георгія Ліхтаровіча здзіўляюць нечаканымі пераўтварэннямі знаёмых вобразаў беларускай сталіцы. Здымкі Аляксея Мяснікова нібыта спынілі на імгненне жыццё — падаецца, калі адвернешся, то наступным разам на здымку будзе ўжо штось іншае. Малюнкі Рытаса Юргеліса нібы вяртаюць нас у дзяцінства, але прымушаюць паглядзець на яго „дарослымі” вачыма.

Лічбы, якія прысутнічаюць на фотаздымках Антона Гіро, надаюць ягоным творам непаўторны каларыт. Са здымкаў Аляксея Паўлюця нібы вее вецер вандраванняў, а карціны Анастасіі Фецісавай водзяць нас уздоўж муроў нейкага старога горада.

Уладзімір ЛАПЦЭВІЧ

Беларусь,беларусы...

Пара праверкі

Раней у Старым свеце лічылася бясспрэчным, што сіла нацыянальнага футбола той ці іншай краіны найлепш вызначаецца нават не ў баталіях зборных, а ў розыгрышах еўрапейскіх кубкаў. Але мінулі часы рамантыкі, на зялёныя палі сёння выходзяць ганяць мячык мільянеры, а глабалізацыя ўсё больш сцірае нацыянальныя асаблівасці стыляў. Значна рэфармаваныя і розыгрышы кантынентальных кубкаў. У Лізе чэмпіёнаў выступаюць далёка не толькі чэмпіёны, але і прызёры найбольш моцных чэмпіянатаў, Кубак кубкаў даўно кануў у лету. А з гэтага года на змену звыкламу Кубку УЕФА, які ўжо перажыў адну істотную рэформу, прыйшла Ліга Еўропы. Роўнасці як не было, так і няма, хоць УЕФА і зараз стараецца падцягваць інфраструктуру адстаючых дзяржаў.

І ўсё ж для сярэдніх і малых краін еўракубкі застаюцца галоўнай меркай сілы, а ўдзел у іх — часам сапраўднай праверкі. Тым больш, што ў такіх клубах няма перанасычанасці легіянерамі як у грандаў. І гэта менавіта той палігон, дзе заўсёды ёсць шанц здзейсніць сенсацыю і скочыць вышэй галавы. Мінулы сезон гэта ўдалося барысаўскаму БАТЭ. Сёлета ж выхаванцам трэнера Віктара Ганчарэнкі патрэбна даказваць сілу. Што ж, здаецца, БАТЭ поўны рашучасці давесці ўсім заканамернасць свайго поспеху. Ад першага кваліфікацыйнага раўнда Лігі чэмпіёнаў флагман беларускага футбола быў вызвалены, а другі этап пачаў досыць упэўнена. Выязная вікторыя ў Скоп’е над „Македоніяй” з лікам 2:0 (галы забілі лепшыя бамбардыры Сяргей Крывец і Максім Скавыш) прымушае верыць, што толькі па вялікай недарэчнасці БАТЭ можа па суме саступіць чэмпіёну балканскай краіны. Дарэчы, барысаўцы ўжо 3 матчы запар не прайграваюць у Лізе чэмпіёнаў на чужых стадыёнах, што раней за нашымі прадстаўнікамі не заўважалася.

А ў Лізе Еўропы ад Беларусі выступаюць ажно тры клубы. Уладальнік Кубка краіны наваполацкі „Нафтан” — абсалютны дэбютант матчаў такога рангу — быў вызвалены ад першага круга кваліфікацыі. І стартаваў ужо ў другім раўндзе хатнім паядынкам супраць бельгійскага „Гента”. Пачаў ён удала, выйграўшы 2:1 (абодва галы ў беларусаў на рахунку Аляксандра Дзегцярова), але зыход дуэлі будзе вырашацца ў Бельгіі. Сталічным „Дынама” і МТЗ давялося пераадольваць 1-ы бар’ер кваліфікацыі. Да гонару абедзвюх каманд яны справіліся з заданнем. „Дынама” ўзяло верх (2:1 дома і 1:1 на выездзе) над іншым клубам са Скоп’е „Рэновай”, што прадстаўляе албанскую частку Македоніі. А МТЗ з напругай адолеў чарнагорскую „Суцьеску” з горада Нікшыч. У гасцях падначаленыя Юрыя Пунтуса разышліся з сапернікам мірам — 1:1, а дома ў дадатковы час былі мацнейшыя з лікам 2:1 (абодва галы забіў Мікалай Рындзюк). Аднак, у другім раўндзе МТЗ не вытрымаў „моманту ісціны”. У сустрэчы на Украіне з данецкім „Металургам” „трактарысты” капітулявалі 0:3 і цяпер дома могуць разлічваць толькі на цуд. Мінскія ж дынамаўцы на галоўным стадыёне краіны ў матчы з нарвежскім „Тромсэ” захавалі сваю браму на замку, але і самі не здолелі забіць. Цяпер усё вырашыцца на полі нашчадкаў вікінгаў. Дынамаўцы занадта далёка адпусцілі наперад БАТЭ ў нацыянальным чэмпіянаце, так што поспех у Лізе Еўропы можа стаць індульгенцыяй для аўтарытэтнага сербскага настаўніка Славалюба Мусліна.

У цэлым старт беларускіх клубаў у еўракубках пакуль ацэньваць рана. Калі, акрамя БАТЭ далей пройдзе яшчэ адзін клуб — адзнака будзе здавальняючай, калі два — добрай.

Уладзімір ХІЛЬМАНОВІЧ

Ціхія дні

Ліпеньская субота. Сонца ля поўдня, калі мы з мужам і ўнучкай Наталькай прыехалі да свае летняе хаткі ў Плёсках адпачыць, падыхаць свежым здаровым паветрам. Вакол ціхыня. Толькі суседка Маруся, убачыўшы ўязджаючую на панадворак машыну, выйшла да плота. Здароўкаемся.

— Што чуваць новага ў вёсцы?

— А што тут новага... — абыякава адказала суседка. — Нябожчыкаў, дзякуй Богу, пару месяцаў не было, вось толькі ў суседкі, бабулі Маньки, кабыла здохла. Ды была ўжо жывіна старая, трыццаць гадоў ёй было. Ды ўсё-такі шкада, па падворку хадзіла, даўно ўжо „на пенсіі", ды адзінокай бабулі было весялей, можна ж азвацца да жывога добрым словам, а мо і панаракаць на старасць. Кабылка такая ж старая, пэўна, разумела бабулю.

— Сена ўжо спраталі? — пацікавіўся мой муж.

— А, дзякуй Богу, спраталі, па адной капіцы „кралі" ад дажджу. Усё рукамі і граблямі трэба было цягаць. Калі лета сухое, муж грабалкай усё сам спрача, я толькі з дасконку пацягну грабелькамі, а то пруцяць прыйшлося сёлета, як за нашых дзядоў, усё ўручную. А цяпер заснуць уначы цяжка, баляць рукі і ногі, — панаракала Маруся.

— А грыбы ў лесе растуць?

— Не ведаю, не хаджу ў лес, працы многа было, чула, што жоўтых плісак трохі ёсць, то дзе і грыбочак трапіцца! — закончыла суседскую сустрэчу Маруся і хутка пабегла на агарод.

Нядзельная, святочная раніца стаяла пахмурная. Пад дзвярыма пішчала ўжо кошка-прыблудка. Прыбегла паснедаць. Накарміўшы сваю „сяброўку", я ўзяла веласіпед і накіравалася, як заўсёды, у прыгожую буслiную вёску Канюкі. Дарога крышку цяжкаватая, размытая ўчарашнім дажджом. Ды што там, якая пахата ў лесе, як лёгка дыхаць, праязджаючы кавалак лясной дарогай! А далей — палеткі, высокае, яшчэ няспелае жыта, сакавітыя зялёныя дрэвы паабапал дарогі. Хацелася б так ехаць, ехаць, ехаць...

Мяне, уязджаючую ў вёску, вітае той жа самы, добра знаёмы мне крыж, аздоблены як штогод свежымі кветкамі. Кланяюся і еду далей. „Мо сустрэну людзей, пагавару, не бачыліся ж мы ад мінулага года", — калоціцца назойлівая думка ў маёй галаве. Еду, еду — і нікога на вуліцы! Толькі кошачка расселася пасярод яе, а ў гнёздах стаяць буслы. Дзесьці на панадворку заспяваў звонка певень. О, бач, хтосьці ўсё-такі прывітаў мяне! Еду далей. Да брамкі выйшла старэйшая жыхарка вёскі ў чорнай хустцы на галаве.

— Добры дзень! — прывіталася я, зраўняўшыся з цёткай і злазячы з веласіпеда.

— Добры дзень, добры дзень! Вы зноў пачалі наведваць нас!

— А так, так, доўга мяне не было, прыехала, каб не падумалі, што мо дзе памерла! А што ў Канюках новага?

— А што ж, нічога добрага, памёр мой муж, засталася я адна. Дзеці далёка, даўно выйшлі з хаты. Ды вось сем чалавек у вёсцы памерла! А ніхто не нарадзіўся. Памалу старыя адходзяць, — засумавала цётка.

Еду далей. І так да канца вёскі больш на вуліцы мне ніхто не сустракаўся. Як заўсёды, паставіла я веласіпед на ўскраіне шашы, а сама падалася да рачнога броду на рацэ Нарве. Глянула на плёскаўскі лес, на даўнія сенакосы, ды нікога і нічога не ўбачыла: ні бацькоў сваіх, ні суседзяў, ні коней з вазамі поўным сена, ні хмары плывучых па рэчцы белых гусей. Вакол ціха і пуста, толькі высокія няскошаныя травы сумна шумяць сваю адвечную песеньку.

Уміг падняўшы веласіпед, я павярнула назад. На зваротнай дарозе зноў не сустрэла нікога з жыхароў. Толькі над рэчкай якісьці малады пан разглядаўся вакол, трымаючы ў руках камеру.

Даязджаючы да свае хаты, сустрэла я суседа Мікалая — святочна апрануты рыхтаваўся ехаць у храм. Тут зараз выцягнула на вуліцу свой веласіпед і суседка Маруся. Яна таксама выбіралася ў пухлаўскую царкву.

— Хадзі, Маруся, завязу цябе на машыне, нашто будзеш пхацца веласіпедам тры кіламетры, — запрасіў яе сусед. Яны хуценька селі ў аўто і памчаліся, як кожную нядзелю, памаліцца ў сваю прыхадскую царкву.

Сонца паднялося вышэй, мары разбегліся па небе, пачаўся, урэшце хіба сонечны, ліпеньскі дзень.

Ніна БРУЧКО

Узнагароды найлепшым

Як штогод, так і сёлета Публічная гімназія і Пачатковая школа ў Чаромсе ўдзельнічалі ў акцыі збірання другаснай сыравіны. Пачатковая школа перадала Гміннай камунальнай гаспадарцы 24 275 алюмініевых банак, 29 945 пластмасавых бутэлек, 2 731 кг макулатуры і 174,5 мяшка шклатары; Гімназія: — 4 894 банак, 6 116 пластмасавых бутэлек, 935 кг макулатуры і 117 мяшкоў шклатары.

Пераможцы акцыі вылучаліся паводле атрыманых балаў. У Пачатковай школе перамаглі: I месца — Юлія Зазулінская (6 190 балаў), II месца — Давід Рошчанка (4 450 балаў) і III месца Патрык Каліноўскі (4 343,5 бала).

На ўзнагароды Гмінная ўправа прызначыла 1 922 зл. За I месца Юлія Зазулінская атрымала „хатні кінатэатр", а ад Сектара аховы асяроддзя Павятовага староства— лічбавы фотаапарат „Канон"; за II і III месца з гміны былі прызначаны „міні-музычныя цэнтры", а ад староства — МП-4-плэеры.

Пераможцамі з Гімназіі аказаліся: I месца — Мілена Пташынская (3 835 балаў) — атрымала „міні-музычны цэнтр", а ад староства — МП-3-плэер; II месца — Эміль Плясун (1 535 балаў) — атрымаў двухспальную палатку; III месца — Аляксандра Шатыловіч (884 балы) — атрымала спальны мяшок.

(УС)

Бацькоўскімі сцяжынкамі

Чатыры гады супрацоўнічаюць Высокаўскі Цэнтр пазашкольнай работы і Дом культуры „Гладышка" мястэчка Кляшчэлі. У гэтым годзе супрацоўніцтва пашырылася да турыстычных летнікаў.

З 19 па 21 чэрвеня турысты-краязнаўцы з гміны Кляшчэлі пабывалі ў гасцях у турыстаў Высокаўскага ЦПР. Разам дзеці прайшлі па маршрутах Рэчыца — Віжное, Рэчыца — Стойлы на выставу „Успаміны бацькаўшчыны" Мікалая Тарасюка. Вельмі ўзрушылі дзяцей сумесныя вогнішча, дыскатэкі, спартыўныя гульні.

Нашы турысты-краязнаўцы на чале са сваім кіраўніком Р. Р. Краўчуком пабывалі ў гасцях у Кляшчэлях. З чацвёртага па шостае ліпеня турысты адпачывалі ў „Гладышцы". На веласіпедах праехалі па маршрутах: 4.07. — Кляшчэлі — Дабрывада — заліў у Рэпчычах; 5.07. — Кляшчэлі — Гайнаўка — Белавежа; 06.07. —Кляшчэлі — Сакі — манастыр св. Дзмітрыя. На заліве пакаталіся на байдарках і катамаранах. У Белавежы наведалі мясцовы храм, помнік ахвярам вайны, музей прыроды. Наведалі самае энергетычнамоцнае месца пушчы — паляну волатаў дубоў, падмацаваліся іх энергетыкай.

Плануюцца летнікі ў жніўні гэтага лета.

Людміла ДУДАР

Фонд „Царкоўная музыка"ў Гайнаўцы
у супрацоўніцтве з Белавежскім нацыянальным паркам,
Белавежскім асяродкам культуры, Аддзяленнем ПТТК у Белавежы запрашае
на арганізаванае пад Ганаровым патранатам Маршалка Падляшскага ваяводства

VII Белавежскія артыстычныя інтэграцыі „Ператоча-2009"

Канцэртуюць калектывы: польскія, беларускія, яўрэйскія, цыганскія, нямецкія, літоўскія, лэмкаўскія...
31.07 — 01.08.2009 г., гадз. 18.00
Амфітэатр у Белавежы

Адгаданка



Шыфраграма

Літары адгаданых слоў, перанесеныя згодна з іх парадкавымі нумарамі ў клеткі роспісу, складуць рашэнне — нігерыйскую пагаворку.

1. снежная бура ў стэпе = 10 _ 20 _ 17 _ 16 _ 11 _;
2. вялікае возера на ўсходзе Турцыі = 21 _ 35 _ 37 _;
3. супраць яго не падуеш = 39 _ 38 _ 45 _ 44 _41 _;
4. працаваў калісь у ярме = 4 _ 3 _ 2 _;
5. мае іх асёл і гаршчок = 31 _ 32 _ 28 _ 29 _;
6. храналагічнае азначэнне дня = 19 _ 18 _ 42 _ 43 _;
7. горад у зліцці Дняпра і Сожа = 23 _ 9 _ 24 _ 27 _;
8. плён з сенажаці = 14 _ 13 _ 15 _ 12 _;
9. музычна-вакальнае мастацтва = 1 _ 6 _ 26 _ 36 _;
10. брат дачкі = 33 _ 22 _ 34 _;
11. паслухмянае дзіця = 46 _ 47 _ 25 _ 5 _;
12. перамяшчэнне на нейкім транспарце = 40 _ 30 _ 8 _ 7 _.

(ш)

Сярод чытачоў, якія на працягу месяца дашлюць у рэдакцыю правільныя адказы, будуць разыграны кніжныя ўзнагароды.

Адказ на адгаданку з 25 нумара

Саколка, блін, Друць, медаль, Крычаў, Дон, актыў, слуга, лета, пыха, шпала, зыб, Азаранка, дол, купец, ліцэй, цеста.

Рашэнне: **Камень кінуты ў добры час лепшы за залаты подкуп у ліхалецце.**

Кніжныя ўзнагароды высылаем **Лукашу Пацэвічу** з Беластока і **Казіміру Радошку** са Свебадзіцаў.

Ніва
ТЫДНЁВІК БЕЛАРУСАЎ У ПОЛЬШЧЫ
PL ISSN 0546-1960
NR INDEKSU 366714

Выдавец: Праграмная рада тыднёвіка „Ніва".
Старшыня: Яўген Вапа.
Адрас рэдакцыі: 15-959 Białystok 2, ul. Zamenhofa 27, skr. poczt. 84.
Тэл./факс: (+48 85) 743 50 22.
Internet: *http://niva.iig.pl/*
E-mail: *redakcja@niva.iig.pl*
Zrealizowano dzięki dotacji Ministra Spraw Wewnętrznych i Administracji.

Галоўны рэдактар: Яўген Вапа.
Намеснік гал. рэдактара: Віталь Луба.
Тэхнічны рэдактар: Адам Паўлоўскі.
Рэдактар „Зоркі": Ганна Кандрацюк-Свярубская.
Публіцысты: Міхась Андрасюк, Мікола Ваўранюк, Аляксандр Вярбіцкі, Ганна Кандрацюк-Свярубская, Ілона Карпюк, Міраслава Лукша, Аляксей Мароз, Мацей Халадоўскі, Віктар Сазонаў, Уладзімір Хільмановіч, Міхась Сцепанюк.
Канцылярыя: Галіна Рамашка.
Друкарня: „Orthdruk", Białystok.
Tekstów nie zamówionych redakcja nie zwraca.

Zastrzega sobie również prawo skracania i opracowania redakcyjnego tekstów nie zamówionych. Za treść ogłoszeń redakcja nie ponosi odpowiedzialności.

Prenumerata krajowa
Termin przyjmowania wpłat do 5-go dnia każdego miesiąca poprzedzającego okres rozpoczęcia prenumeraty. Wpłaty przyjmują urzędy pocztowe na terenie województwa podlaskiego oraz oddziały „RUCH" i „KOLPORTER" na terenie całego kraju. Cena prenumeraty kwartalnej — 26 zł., półrocznej — 52 zł., rocznej — 104 zł.

Prenumerata z wysyłką za granicę
Wpłaty przyjmuje „RUCH" S.A. Oddział Krajowej Dystrybucji Prasy, ul. Jana Kazimierza 31/33, 01-248 Warszawa; telefony: +48(0)22 53-28-823 — prenumerata płatna w walucie obcej, 0-2253-28-816, 53-28-819; — prenumerata płatna w PLN; nr faxu: 0-2253-28-734

Prenumerata w redakcji
Planowana ilość numerów „Niwy" w 2009 roku — 52.

Poczta zwykła: Cena 1 egz. wraz z wysyłką w kraju wynosi 3,7 zł. Cena 1 egz. wraz z wysyłką za granicę — kraje europejskie — 5,00 zł. — kraje pozaeuropejskie — 5,20 zł.

Poczta lotnicza: Cena 1 egz. wraz z wysyłką za granicę: — kraje europejskie — 6,00 zł, — Ameryka Północna, Afryka — 6,70 zł., — Ameryka Południowa — 7,80 zł., — Australia i Oceania — 10,00 zł.

Wpłaty przyjmuje:
Rada Programowa Tygodnika „Niwa",
BANK PEKAO S.A. O/Białystok
38 1240 5211 1111 0000 4929 0945

Nakład: 1 000 egz.

БАСОВІШЧА 2009

ФЭСТЫВАЛЬ МУЗЫКІ МАЛАДОЙ БЕЛАРУСІ 17-18 ЛІПЕНЯ ГАРАДОК

фотарэпартаж Ілоны КАРПЮК



25.07 — 31.07

(22.03. — 20.04.) Найлепшы час пайсці ў адпачынак. Будзе ён удалы — незалежна ад таго, ці будзеш актыўны, ці будзеш ляжаць як блін на пляжы. Гарачыя флірты! Ды пільнуй каштоўных рэчаў, ключ ад хаты пакінь даверaным людзям. Шкада, што плады твае працы схочуць спажываць іншыя.

(21.04. — 21.05.) Цяжкавата дагаварыцца нават з самымі блізкімі. Хтось даверыць табе сакрэт. Пасма поспехаў, так кампанейскіх, як і фінансавых. Разгорнеш крылы і забудзеш аб любых праблемах.

(22.05. — 22.06.) Планеты інспіруюць цябе да самастойнага і адважнага дзеяння. Добры час прыгледзецца самому сабе і выкарыстаць усе свае асабістыя і прафесійныя козыры. У апошнія дні ліпеня будзеш майстрам у абятніцах немагчымых для здзяйснення.

(23.06. — 23.07.) Будзь больш асцярожным у праектах і планах, бо ахвота хуткага і лёгкага прыбытку заслоніць табе рызыку. Падтрымлівай свайго партнёра, які мае цяпер свае пяць хвілін. Калі здарыцца табе прыхварэць, хутка з гэтага выйдзеш.

(24.07. — 23.08.) Рэзультаты твае працы стануць усім бачнымі. На жаль, канікулы сёлета ў цябе сціплейшыя. Пераканаешся, што каб здабыць каштоўнае, трэба моцна пастарацца (і ў матэрыяльным свеце, і ў пачуццях).

(24.08. — 23.09.) Больш часу прызначыш на тое што любіш, не спяшайся і не рабі нічога праз сілу. Безупынныя натацыі з'яўляюцца малаканструктыўнай формай дапамогі іншым; блізкія могуць палічыць цябе нават нахабам.

(24.09. — 23.10.) 25-29.07. шчасце, спрыяючыя, шчаслівыя выпадкі, поспехі ў прафесійным і прыватным плане. Хтосьці зробіць табе асаблівую прыемнасць. Але не ўваходзь з нікім у ніякія інтарэсы, не наладжвай супрацоўніцтва, ані не думай аб новай пасадзе. Пакідаючы дабытак пад апеку найбліжэйшым, падумай, ці добра робіш.

(24.10. — 22.11.) Не правакуй нікога і не паддавайся зачэпкам. У падарожжы шмат задзіўляючых выпадкаў; будзь асабліва асцярожным едучы на машыне. У фінансах крыху лепш у апошнія дні ліпеня. Добра падзейнічаюць на тваю форму водныя працэдуры ды збалансаваная дыета.

(23.11. — 22.12.) Ідэальны момант на паездкі ў мілай кампаніі, на рандэву, кампанейскія сустрэчы. Хоць 28-31.07. не ангажуйся ў афармлянне дарожных і іншых важных папераў, бо толькі страціш час. Але паправіцца твой аптымізм!

(23.12. — 20.01.) Хопіш вецер у ветразі! У твой знак перасунецца паўночны вузел Месяца, дасць табе шанцы на вырашэнне найважнейшых спраў. І вочы вытарашчаць тыя, хто прывык да твае памяркоўнасці і спакою. Толькі лішне не фарсіруй здароўя.

(21.01. — 19.02.) Добра пільнуй грошай (можаш згубіць кашалёк або нарвацца на ашуканцаў). Нервовасць, неспакой; ненайлепшы час на афармлянне бізнесавых спраў. 25-28.07. могуць быць праблемы на працы і ў службовых кантактах; не будзь зайздросны і прагны, а ў інтарэсах трымайся жалезных прынцыпаў.

(20.02. — 21.03.) Дамаўляйся на рандэву і іншыя мілыя сустрэчы. Калі нават дадуць табе чорную поліўку, дык не будзеш перажываць. З новай асобай адчуеш, што ведаеце адзін аднаго ад заўжды. Застрахуй жыллё. Сваю актыўнасць накіроўвай на самае найважнейшае.

Агата АРЛЯНСКАЯ

Сцяг эсперанцкага руху

Ніва ПРА ЭСПЕРАНТА

Апрацаваў Віталь ЛУБА

Людвік Заменгоф

Эсперанта ў Беларусі

У 1887 г. Людвік Заменгоф пад псеўданімам Доктар Эсперанта выдаў кнігу „Міжнародная мова. Прадмова і поўны падручнік" на рускай, нямецкай, фрэнцузскай і польскай мовах, а ў 1888 г. — на англійскай. З таго часу пачынаецца паступовае развіццё эсперанцкага руху. Ужо ў 1888 г. у Нюрнбергу ў Германіі паўстаў клуб аматараў эсперанта, а год пазней выйшла першае перыядычнае выданне „La Esperantisto".

У Рускай імперыі, у склад якой тады ўваходзілі беларускія землі, першая група аматараў эсперанта згуртавалася ў Маскве ў 1889 г., а ў 1891 г. у Пецярбургу завязалася першая афіцыйная суполка „Надзея" („Espero").

У Беларусі мова эсперанта шырэй пачынае распаўсюджвацца ў пачатку XX стагоддзя. У 1903 г. у Гомелі вывучае яе Давід Выгодскі (1894-1943), пазнейшы перакладчык з іспанскай і партугальскай моў і літаратурны крытык. У 1904 г. міжнароднай мовай займаецца Іван Фёдараў (1883-1971), беларускі пісьменнік вядомы пад псеўданімам Янка Маўр, а ў 1905-1906 гг. вывучае яе іншы беларускі пісьменнік Цішка Гартны (1887-1937) — вядомы таксама як дзеяч беларускага нацыянальна-вызваленчага руху (сапраўднае прозвішча Зміцер Жылуновіч). У 1908 годзе эсперанта вывучыў Георгій Дзешкін, які ў 1909 г. аднавіў суполку эсперантыстаў у Вільні, якая нейкі час існавала з 1892 г. Ён пісаў вершы на мове эсперанта, публікаваў у часопісах, выдаваў асобнымі кніжкамі.

* * *

Новы перыяд у развіцці эсперанцкага руху пачаўся пасля 1917 года, пры савецкай уладзе, калі дзейнасць эсперантыстаў бачыцца як дапаможны сродак паразумення міжнароднага пралетарыяту. Эсперанта пачынае выкладацца на курсах і ў гуртках. У 1918 г. у Гомелі ствараецца група эсперантыстаў, у якой міжнародную мову вывучае Зміцер Снежка (1903-1959), пазней адзін з лідараў эсперанцкага руху даваеннага часу. У школах Чэрвеня ў 1919 г. мове эсперанта вучыць Э. Палсемен. У гэтым жа годзе курсы эсперанта ў Віцебску вядзе Грыгаровіч, а ў 1919-1921 гг. кіруе імі Е. М. Флейс. У Віцебску адбыўся прыфрантавы з'езд эсперантыстаў з Беларусі і Смаленшчыны.

У 1921 г. у Петраградзе адбыўся I з'езд Саюза эсперантыстаў савецкіх краін, пасля перайменаваны ў Саюз эсперантыстаў Савецкіх Рэспублік (СЭСР). Сябрам Цэнтральнага Камітэта СЭСР стаў Б. Шабер з Віцебска. З выдадзенай СЭСР у 1923 г. адрасной кнігі вынікае, што суполкі эсперантыстаў дзейнічалі ў Бабруйску, Віцебску, Гомелі, Заслаўі, Кублічах, Магільне, Мінску, Навазыбкаве, Рэчыцы, Чэрвені. У Мінску гарадскую суполку ўзначальваў Зміцер Снежка.

Дом у Беластоку, у якім нарадзіўся Людвік Заменгоф (не захаваўся)

Цэнтральнае Бюро Беларускай арганізацыі СЭСР паўстала ў Мінску ў студзені 1924 г., а кіравалі ім Ян Клыс (старшыня) і Зміцер Снежка (сакратар). Год пазней у сталіцы БССР адбылася I Усебеларуская канферэнцыя СЭСР. Тады ў Савецкай Беларусі дзейнічала 37 гурткоў эсперантыстаў (м.інш. у Мінску, Віцебску, Гомелі, Рэчыцы, Слуцку, Талачыне, Жлобіне, Смілавічах). У эсперанцкім руху вылучаюцца новыя энергічныя маладыя людзі: Міхаіл Мандрык (1902-2003) і Б. Берын у Рэчыцы ці Гірш Бранзбург у Віцебску. Гэты апошні ў 1923-1924 гг. арганізуе курсы эсперанта для медыцынскіх работнікаў.

ДЪ ЭСПЕРАНТО

МЕЖДУНАРОДНЫЙ ЯЗЫКЪ.

ПОЛНЫЙ УЧЕБНИКЪ.

ВАРШАВА

1887.

Першы падручнік эсперанта, выдадзены ў Варшаве ў 1887 г.

У 1920-х гадах мова эсперанта становіцца вельмі папулярнай. У многіх установах Мінска праводзяцца арганізацыйныя сходы эсперанцкіх гурткоў, чытаюцца даклады, ладзяцца курсы. Напрыклад, 16 лістапада 1924 г. на ўрачыстым сходзе гуртка эсперантыстаў Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта, на якім прысутнічала 300 чалавек, з дакладам „Эсперанта і навука" выступіў прафесар Вацлаў Іваноўскі. Апрача БДУ эсперанцкія гурткі дзейнічалі ў іншых сталічных установах: напрыклад, у Польскім педагагічным тэхнікуме, пры Цэнтральным камітэце прафсаюзаў, Цэнтральным партыйным клубе, Цэнтральным камсамольскім клубе, Цэнтральным яўрэйскім клубе. Дзейнічаюць гурткі і ладзяцца курсы, напрыклад, у Бабруйску, Віцебску, Гомелі, Навабеліцы, Навазыбкаве і іншых мястэчках. Толькі ў 1925 г. эсперанта вывучалі больш за 2 тысячы чалавек. За вывучэнне мовы эсперанта браліся нават цэлыя калектывы, напрыклад, ячэйка камуністычнага саюза моладзі пры станцыі Віцебск.

Для шырокага распаўсюджання эсперанцкай ідэі неабходным стала прыцягненне ўвагі друку. З гэтай мэтай у Мінску ствараецца Беларускае эсперанцкае газетнае інфармацыйнае бюро, якое за першы год працы выпусціла больш за 400 нататак і артыкулаў пра мову эсперанта і эсперанцкія мерапрыемствы. Інфармацыйнымі матэрыяламі карысталіся беларускія („Савецкая Беларусь", „Звязда"), польскія („Млот"), яўрэйскія („Вэкэр") газеты і іншыя выданні. У 1924 г. пачалі выходзіць „інфармацыйныя лісты" Цэнтральнага бюро Беларускай арганізацыі СЭСР, мэтай якіх было аб'яднанне эсперантыстаў. На I канферэнцыі Беларускай арганізацыі СЭСР у маі 1925 г. удзельнічала 400 дэлегатаў і гасцей. А два месяцы пазней на II з'ездзе СЭСР у Маскве было адзначана, што па колькасці эсперантыстаў — членаў СЭСР Мінск знаходзіцца на другім месцы пасля Масквы.

Асаблівую падтрымку эсперанцкаму руху сталі аказваць партыйныя і камсамольскія камітэты, якія ўбачылі магчымасць выкарыстання мовы эсперанта для міжнароднай рабочай сувязі. Эсперантысты прыцягваюцца да гэтай работы на прадпрыемствы і ў арганізацыі. Часопіс „Международный язык" адкрыў, прымеркаваную да гэтай справы, рубрыку „Кадяндар эсперкара", СЭСР выдаваў лістоўкі „La vero pri Sovetio" (Праўда аб Савецкім Саюзе"), а ў 1934 г. Беларускі камітэт СЭСР стаў выдаваць бюлетэнь „Soveta Blankrusio" („Савецкая Беларусь").

Міжнароднай рабочай сувязі на мове эсперанта многа ўвагі адводзіў беларускі друк. Напрыклад, газета „Беларуская вёска" вяла спецыяльную рубрыку „Сярод эсперантыстаў", у якой друкаваліся лісты і допісы замежных эсперкараў (эсперанцкіх карэспандэнтаў). Аб вялікім значэнні, якое надавалася міжнароднай сувязі, сведчыць публікацыя ў „Савецкай Беларусі" ад 8 верасня 1926 г.: „Шырокае распаўсюджанне атрымала перапіска рабочых Беларусі са сваімі замежнымі братамі па класу. З пачатку забастоўкі шахцёраў Англіі ў розныя гарады гэтай краіны мінскія эсперантысты накіравалі каля 20 пісьмаў, у якіх віталі барацьбу замежных пралетарыяў з капіталам. У адказ яны атрымалі каля 60 пісьмаў, у якіх англійскія шахцёры расказвалі аб сваім цяжкім матэрыяльным становішчы, барацьбе з буржуазіяй за свае правы, выказвалі падзяку за дапамогу. Англійскі рабочы Тэйлар, напрыклад, пісаў: «Сардэчнае дзякуй рабочым СССР і асабліва вашай Беларусі за тую дапамогу, якую вы аказваеце нам і нашым сем'ям. Не аслабляйце пакуль што вашай дапамогі. Прыйдзе час — і мы аддзячым вас за яе. Пішыце пісьмы: яны падтрымліваюць у нас бадзёрасць, умацоўваюць наш баявы дух. Няхай не забываюць нас вашы эсперантысты»".

У 1924-1933 гг. з Беларусі за мяжу было адпраўлена 23 тысячы лістоў, апублікавана ў замежным друку больш за 1,5 тысячы артыкулаў аб дасягненнях БССР. У гэтым жа перыядзе замежныя эсперантысты дасылалі больш за 19 тысяч пісем, траціна якіх апублікавана была ў беларускім друку („Шыпшына", „Узвышша", „Маладняк", „Беларуская работніца і сялянка", „Звязда", „Савецкая Беларусь", „Беларуская вёска", „Калгаснік Беларусі", і інш.). Эсперанцкія карэспандэнты ўзнагароджваліся ганаровымі граматамі, прэміямі, а найбольш актыўныя сталі героямі брашуры П. Кірушына

працяг ☞IV

Янка Купала

А хто там ідзе?

А хто там ідзе, а хто там ідзе
У агромністай такой грамадзе?
— Беларусы.

А што яны нясуць на худых плячах,
На руках ў крыві, на нагах у лапцях?
— Сваю крыўду.

А куда ж нясуць гэту крыўду ўсю,
А куда ж нясуць напаказ сваю?
— На свет цэлы.

А хто гэта іх, не адзін мільён,
Крыўду несць наўчыў, разбудзіў іх сон?
— Бяда, гора.

А чаго ж, чаго захацелась ім,
Пагарджаным век, ім, сляпым, глухім?
Людзьмі звацца.

Janka Kupala

Sed kiu jen iras?

Sed kiu jen iras, tie laŭ voj'
En granda amas', en granda malĝoj'?
— Belorusoj.

Sed kion do portas, homo ĉe hom',
Kaj ĉiu malgrasa kvazaŭ fantom'?
— Ofendiĝon.

Sed kien do portas komune ĝin,
Al kiu por plendi je la destin'?
— Al tutmondo.

Sed kiu do ilin, ne nur milion',
Instigas batali en ĉi-kolon'?
— Malfeliĉo.

Sed kia do estas ilia vol',
De tiu blinda, surda popol'?
— Homoj esti.

Tradukis **Adamo Paŭlukavec**

Віктар Швед

Цягнікі

Цягнікоў імклівых вельмі многа,
Што бягуць у розныя бакі.
Не вязуць нікога дарагога
Абыякавыя цягнікі.

Ды бываюць цягнікі другія,
Іх прыезд ёсць радасны такі.
Нам вязуць істоты дарагія
Блізкія надзвычай цягнікі.

Госць сардэчны зноўку на змярканні
Нам з купэ паслаў узмах рукі.
Астаўляюць горыч развітання
Разлучаючыя цягнікі.

Victar Ŝved

Vagonaroj, vagonaroj

Kutimaj estats vagonaroj,
Rapidantaj tra la lando,
Kuregantaj sen la gastoj,
De la flanko, ĝis la flanko.

Tamen estas vagonaroj,
Tre ĝojantaj niajn korojn,
Kuregantaj kun la gastoj,
Ni atendas vagonarojn.

La amikos nin salutas,
Kaj adiaŭas per la manoj,
Sed doloron al ni lasas,
Vagonaroj, vagonaroj.

Tradukis **Rikardo Butajlo**

З эсперанта вакол свету

Выдатнейшым беларускім эсперантыстам без сумнення быў Янка Маўр (сапраўднае прозвішча Іван Фёдараў) — адзін з пачынальнікаў беларускай літаратуры для дзяцей. Пры дапамозе гэтай універсальнай мовы быў звязаны бадай з усім светам. Ён, як той Жуль Верн, нідзе не быў, а ўсё ведаў да драбніц — гадзінамі мог расказваць пра Інданезію, Барнео, Суматру, Новую Зеландыю ці Аўстралію. Гэта дзякуючы веданню мовы эсперанта ўзніклі яго творы прыгодніцкага жанру.

Іван Фёдараў нарадзіўся 10 мая 1883 г. у латвійскім партовым горадзе Лібава (цяпер Ліепая). Ягоны бацька, беззямельны селянін, трапіў сюды ў пошуках лепшай долі і ўладкаваўся столярам у порце. Пасля заўчаснай смерці бацькі маці вярнулася з малым сынам у вёску Лебянішкі Ковенскай губерні, дзе прайшло яго дзяцінства. Пасля заканчэння пачатковай школы паступіў у рамеснае вучылішча ў Коўне. З 1899 г. працягваў навуку ў Панявежскай настаўніцкай семінарыі. За ўдзел у гуртку рэвалюцыйнай моладзі быў выключаны з ліку семінарыстаў. У 1903 г. экстэрнам здаў экзамен і атрымаў званне настаўніка пачатковай школы. Працаваў памочнікам настаўніка ў Новым Месцы (цяпер у Літве), у вёсцы Бытча на Барысаўшчыне. У 1906 г. удзельнічаў у нелегальным з'ездзе настаўнікаў у вёсцы Мікалаеўшчына. Разам з Якубам Коласам і іншымі актыўнымі ўдзельнікамі быў аддадзены пад суд, пазбаўлены права выкладаць у школе і ўзяты пад нагляд паліцыі. Толькі ў 1911 г. удалося яму ўладкавацца выкладчыкам геаграфіі і гісторыі ў Менскую прыватную гандлёвую школу. Пасля 1917 г. працаваў у школе, у Рэспубліканскім саюзе работнікаў асветы, у Наркамаце асветы БССР, у Беларускім дзяржаўным выдавецтве.

Выкладаючы ў школе гісторыю і геаграфію, Маўр наладжваў для вучняў цікавыя завочныя падарожжы ў далёкія краіны і ў глыб вякоў. Між іншым з гэтай мэтай на мове эсперанта, якую вывучыў у 1904 г., вёў перапіску з замежнымі эсперантыстамі, удзельнічаў у міжнародных з'ездах эсперантыстаў, здабываў матэрыялы для завочных школьных падарожжаў. Міжнародная мова шмат у чым замяніла Маўру падарожжа вакол свету, узбагаціла яго веды і мастацкую палітру. Натуральным працягам настаўніцкай працы стала яго літаратурная творчасць. З фельетонамі выступіў у перыядычным друку ў 1923 г., а першае апавяданне апублікаваў у 1926 г. у часопісе „Беларускі піянер". Першая аповесць „Чалавек ідзе" з'явілася ў 1927 г. і напісана была ў форме экскурсіі ў мінулае. Вынікам завочных школьных падарожжаў сталі аповесці „У краіне райскай птушкі" (1928), „Сын вады" (1928).

„Маўр не вандраваў па Ціхім акіяне і не рабіў экскурсій у тыя далёкія краіны, пра якія так добра і дакладна расказваў, — адзначыў Алесь Якімовіч ва ўступе да кнігі „Чалавек ідзе" (Мінск 1989). — Пісаў ён іх на „галубятні" аднаго з дамоў на вуліцы Нова-Маскоўскай. Дабірацца да Маўра трэба было праз доўгія цёмныя вышкі. І я заўсёды баяўся, каб не разбіць упоцемку лоб аб стаякі. Упершыню на гэтай „галубятні" я ўбачыў энцыклапедыю Бракгаўза і Эфрона, кнігі вядомых падарожнікаў Міклухі-Маклая, Іоніна, Белінсгаўзена, Кука, Галаўніна і іншых. Сюды ж прыходзілі пісьмы і пакеты ад эсперантыстаў з усяго свету". Маўр так маляўніча апісаў экзатычныя краіны, што вядомы мінскі падарожнік прафесар Бордакаў нізашто не хацеў паверыць, што аўтар не быў на Новай Гвінеі ці Яве, паколькі не знаходзіў фактаграфічных памылак.

Мова эсперанта мела вялікае значэнне ў працы над раманам „Амок" (1930), у аснову якога ляглі падзеі 1926 г., калі жыхары вострава Ява ўступілі ў барацьбу з галандскімі каланізатарамі. Паўстанне пачалося на галандскім ваенным караблі „Саардам". Хутка яно як амок ахапіла ўсю краіну, народ пад кіраўніцтвам сваіх правадыроў выступіў на барацьбу за вызваленне. „У 1926 годзе было паўстанне на Яве, — успамінаў трыццаць гадоў пазней Янка Маўр. — У парыжскай эсперанцкай газеце я прачытаў некаторыя цікавыя факты аб ім. Тады я напісаў эсперантысту на Яве пісьмо з просьбай выслаць дадатковыя матэрыялы і атрымаў каштоўныя пісьмы, часопісы са здымкамі. Пасля я напісаў яшчэ ў Галандыю і атрымаў матэрыялы адтуль. У выніку выйшла мая кніга „Амок". І не раз яшчэ атрымліваў я патрэбныя мне матэрыялы з Францыі, Германіі, нават з Чылі". А калі аднойчы Маўр сустрэў у Маскве аднаго інданезійскага дыпламата, які чытаў „Амок", той яму выявіў, што з гэтага рамана даведаўся пра ўсю праўду аб паўстанні на галандскім караблі „Саардам".

У 1920-я гады эсперанта набывае шырокае распаўсюджанне, становіцца адной з моў, на якой вяшчае беларускае радыё. Апрача інфармацыйных і культурных перадач у эфіры з'явіліся курсы мовы эсперанта. З лютага 1926 г. па панядзелках 45-хвілінныя ўрокі міжнароднай мовы на мінскай радыёстанцыі вёў Янка Маўр.

Пасля вайны эсперанцкі рух, між іншым па ініцыятыве Янкі Маўра, аднавіўся ў 1955 г. Два гады пазней у Мінску стварылася ініцыятыўная група па згуртаванні аматараў эсперанта, якая абрала часовае бюро з пяці чалавек. У майскім нумары часопіса „Беларусь" ад 1957 г. Янка Маўр выступіў з артыкулам „Эсперанта". Пад канец 1957 г. БелТА паведаміла: „8 снежня ў памяшканні Беларускага інстытута народнай гаспадаркі імя Куйбышава адбыўся рэспубліканскі сход эсперантыстаў, прысвечаны ўтварэнню Саюза эсперантыстаў Беларусі. Прынят статут саюза, выбрана цэнтральнае бюро і рэвізійная камісія". Ганаровым старшынёй БСЭ абраны быў Янка Маўр.

З нагоды 100-гадовага юбілею з дня нараджэння стваральніка эсперанта 1959 год быў аб'яўлены „Годам Заменгофа". Наш тыднёвік пісаў тады: „Урачыстыя святкаванні, якія з гэтага выпадку адбудуцца ва ўсіх краінах, арганізуюцца пад пратэкцыяй Міжнароднага Ганаровага Патраната, якія створан з 118 вядомых асабістасцей 28 краін. Кульмінацыйны пункт урачыстасцей адбудзецца ў час 44-га Сусветнага кангрэса эсперантыстаў у жніўні ў Варшаве. (...) У склад гэтага Патраната ўваходзіць таксама вядомы беларускі пісьменнік Янка Маўр".

Янка Маўр памёр 3 жніўня 1971 г.

У Дзяржаўным музеі гісторыі беларускай літаратуры ў Мінску 12 мая 2008 г. адкрылася выстава „Чараўнік з краіны маленства", прысвечаная 125-годдзю з дня нараджэння Янкі Маўра. Экспазіцыя распавядала пра жыццёвы і творчы шлях пісьменніка, пра яго творы на гістарычную, ваенную, прыгодніцкую і фантастычную тэматыку. Прадстаўлены былі рукапісы і фатаграфіі, асабістыя рэчы пісьменніка, карціны і ілюстрацыі да яго твораў, кнігі і публікацыі, а таксама фрагменты калекцыі паштовых марак сям'і Янкі Маўра. Як зазначыла дачка пісьменніка Наталля Міцкевіч, „ён, як эсперантыст, шмат перапісваўся са сваімі калегамі з многіх краін свету. Замежныя паштовыя маркі з канвертаў аддаваў мне з пажаданнем вывучыць гісторыю і геаграфію гэтых краін".

З 1993 года ў Беларусі прысуджаецца Літаратурная прэмія імя Янкі Маўра за лепшыя творы для дзяцей. Імем пісьменніка названа Мінская абласная дзіцячая бібліятэка. У сталічнай сярэдняй школе № 126 імя Янкі Маўра адкрыты музей пісьменніка, які можна наведаць шляхам інтэрнэту па адрасе **http://sch126.minsk.edu.by/main.aspx?uid=85593.**

Ніўскія карэспандэнты-эсперантысты

У ліку ніўскіх карэспандэнтаў, якія сваімі допісамі ўзбагачалі змест нашага штотыднёвіка, былі і эсперантысты. Найбольш вядомыя — Баляслаў Манкевіч (на здымку) і Рышард Бутайла.

Баляслаў Манкевіч нарадзіўся 15 чэрвеня 1905 г. у вёсцы Кароліна каля Рубяжэвіч Стаўбцоўскага раёна Мінскай вобласці ў беларускай каталіцкай сям'і. Пасля заканчэння сямігодкі ў Койданаве паступіў на двухгадовыя настаўніцкія курсы ў Мінску (1926-1928). Аднак працаваць настаўнікам яму не давялося, бо ягоную „кулацкую" сям'ю саслалі ў Расію, а яго самога прызвалі ў Чырвоную Армію, у якой служыў да лютага 1929 г. Каб пазбегнуць высылкі ў Сібір ноччу з 14 на 15 ліпеня 1930 г. ён разам з братам перайшоў савецка-польскую граніцу ў Коласаве. Спачатку Баляслаў спыніўся ў Вільні ў далёкага сваяка, але там цяжка было знайсці пастаянную працу, таму пасля вайсковай службы ў 1931-1932 гг. падаўся ў Варшаву, дзе знаёмыя ўладкавалі яго на працу рэферэнтам па справах статыстыкі ў авіялініях „Лёт". І ў Вільні, і ў Варшаве Манкевіч трымае кантакт з беларускім асяроддзем. У сталіцы існавала ўжо беларуская арганізацыя, у якой дзейнічаў м.інш. Пятро Ластаўка. У 1938 г. экстэрнам здаў экзамен на атэстат сталасці і паступіў у Акадэмію палітычных навук, якую закончыў ужо пасля вайны, у 1949 г.

У 1952 г. Баляслаў Манкевіч працуе рэдактарам і намеснікам кіраўніка рэдакцыі Дзяржаўнага школьнага выдавецтва. Да 1958 г. пад ягонай рэдакцыяй выйшла 45 падручнікаў для беларускіх школ на Беласточчыне, з ліку якіх 12 было ім перакладзеных з польскай на беларускую мову.

Калі ў 1956 г. стала выходзіць „Ніва", Баляслаў Манкевіч становіцца яе актыўным карэспандэнтам. Для „Нівы" падрыхтаваў цыкл „Гутарак аб мове", які друкаваліся ў 1956-1957 гг. (першая гутарка — у № 35 ад 28.10.1956 — апошняя — у № 7 ад 17 лютага 1957 г.). Прымае ўдзел у падрыхтоўцы „Падручнага польска-беларускага слоўніка" (Варшава 1962), карэктуе беларускую частку працы польскага мовазнаўца-славіста Уладзіслава Курашкевіча „Нарыс усходнеславянскай дыялекталогіі" (Варшава 1963). Быў членам праграмнай камісіі школ з беларускай мовай навучання, старшынёй экзаменацыйнай камісіі па беларускай мове пры Міністэрстве ўнутраных спраў, рэдактарам праграм па навучанні беларускай мовы ў Міністэрстве асветы.

У 1961 г. Баляслаў Манкевіч перайшоў на працу ў Цэнтральны саюз ашчадна-пазыковых кааператываў, у якім працаваў да выхаду на пенсію ў 1971 г. Будучы на пенсіі працягвае перакладчыцкую дзейнасць. У 1975 г. на польскай мове выходзяць кніжкі Івана Пташнікава „Łonwa" („Лонва"), у 1977 г. — „Tartak" („Тартак"), а ў 1979 г. — „Płonące wzgórze" („Найдорф"). У 1989 г. Лодзінскае выдавецтва разам з мінскім „Юнацтвам" выдалі на польскай мове кнігу нарысаў „Малыя героі вялікай вайны", другую частку якой складаюць ягоныя пераклады.

Разам з тым Баляслаў Манкевіч дзейнічаў у эсперанцкім руху. У 1958 г. быў ён абраны генеральным сакратаром Польскага саюза эсперантыстаў і рэдактарам штомесячніка „Pola Esperantisto" („Польскі эсперантыст"). Займаецца таксама перакладчыцкай дзейнасцю на мову эсперанта. У 1959 г. з'явіўся ў друку даведнік „Pollando: Geografio. Historio. Kulturo. Mallongaj informoj", перакладзены ім і Анджэем Райскім, а ў 1962 г. — кніжка Адольфа Цібароўскага і Станіслава Янкоўскага „Varsovio rekonstruita". Пераклаў таксама кнігі Уладыслава Мізёлка „Enkondukto al ekumenaj problemoj" („Wprowadzenie do zagadnień ekumenicznych" — 1978), Яна Дабрачынскага „La Dia avarulo" („Skąpiec Boży" — 1979).

Баляслаў Манкевіч памёр у Варшаве 16 мая 1995 г.

Рышард Бутайла нарадзіўся 29 верасня 1924 г. у Вільні. Пасля вайны, так як многія жыхары Віленшчыны, апынуўся ў Польшчы. З Беласточчынай сутыкнуўся ў 1946 г., калі служыў у войску. Пасля так успамінаў гэты перыяд: „Напісаў я ў „далёкім Беластоку" (жыў тады ў Свінавусці — рэд.). Праўда, на карце ён далёкі, але для мяне блізкі ён не толькі ў вершы. Я гэтую зямлю адчуваю зусім рэальна. На гэтай жа зямлі праляжаў я не раз з карабінам у руках, каб абараняць жыхароў гэтай зямлі ад бушуючых тады рознага роду бандаў. Гэта быў 1946 год — неспакойны, бурлівы, цяжкі для нас, салдат, і для жыхароў, асабліва сялян. Гэта ўжо гісторыя. Гісторыя Беласточчыны — мая гісторыя, запісаная на 22 годзе жыцця" („Ніва", 26.12.1982 г.). Рышард Бутайла сябраваў з Янам Тарчэўскім, унукам Францішка Багушэвіча, які ў 1944 г. пераехаў з Віленшчыны ў Польшчу і з 1945 г. жыў у Хошчне пад Шчэцінам, перапісваўся з іншым нашым карэспандэнтам Анатолем Маўчуном з Познані. Апошні так успамінаў яго ў лісце ад 8 красавіка 2009 г.: „Маё знаёмства з ім пачалося, калі Янку Тарчэўскаму памерла жонка, а Бутайла ў „Ніве" прасіў, каб дапамагчы Тарчэўскаму ў ягонай бядзе хаця б добрым словам. Гэты чалавек быў вельмі актыўны, у Свінавусці, здаецца, нават супрацоўнічаў з моладзевымі арганізацыямі. Бо калі ўдалося мне раз дастаць „Кругазор" з беларускай песняй „Вы шуміце, шуміце нада мною бярозы", я гэтую песню паслаў усім знаёмым (Данчык яшчэ і зараз выконвае яе ў сваёй апрацоўцы). Бутайла перакладаў словы гэтай песні на польскую мову для нейкага свайго калектыву. На пачатку меў ён цяжкасці са здабыццём слоўніка эсперанцкай мовы і якраз у Познані ён гэта здабыў. (...) А вось карыстаючыся мовай эсперанта ён утрымліваў кантакты з многімі замежнікамі".

Рышард Бутайла быў карэспандэнтам не толькі „Нівы". Пісаў яшчэ ў „Głos Robotniczy", які выходзіў у Лодзі, у „Głos Szczeciński", у „Głos Woliński", што выдаваўся ў Свінавусці, у Польскае радыё ў Шчэціне. Стаў супрацоўнічаць з эсперанцкай рэдакцыяй Польскага радыё ў Гданьску. „Тут я меў сатысфакцыю, што ў адной з перадач чыталі мой эсперанцкі верш, напісаны з нагоды вызвалення Гданьска", — напісаў ён нам у допісе, які друкаваўся ў „Ніве" ад 26.12.1982 г. Перакладаў вершы Максіма Танка, Петруся Броўкі, якія высылаў у рэдакцыі эсперанцкіх часопісаў, між іншым у варшаўскі „Pola Esperantisto", французскі „La Juna Penso" („Маладая думка"), аўстрыйскі „Internaciisto" („Інтэрнацыяналіст"). У апошнім выданні ў верасні 1980 года апублікаваў свой артыкул. Перакладаў таксама паэзію Віктара Шведа. 4 кастрычніка 1981 г. „Ніва" апублікавала пераклад яго верша „Цягнікі" на мову эсперанта. Рышард Бутайла напісаў тады: „Пасылаю Вам верш на эсперанцкай мове, перакладзены мною. Гэта верш Віктара Шведа „Цягнікі". Верш спадабаўся маім сябрам-эсперантыстам на Літве, на Беларусі і ў Чэхаславакіі. Думаю, што міла будзе прачытаць аўтару свой верш на мове эсперанта. Спадзяюся таксама, што верш спадабаецца эсперантыстам, якія жывуць у горадзе доктара Заменгофа — у Беластоку".

Успамінаючы Рышарда Бутайлу на старонках „Нівы" (29.08.2004) Анатоль Маўчун пісаў: „Быў паслужлівы. Гатоў кожнаму памагаць, хаця хварэць даводзілася яму часта (...). Раз выявіў, што ён — грамадзянін свету".

Рышард Бутайла памёр 29 красавіка 2003 г. у Свінавусці.

Максім Багдановіч

Зорка Венера

Зорка Венера ўзышла над зямлёю,
светлыя згадкі з сабой прывяла...
Помніш, калі я спаткаўся з табою,
зорка Венера ўзышла.

З гэтай пары я пачаў углядацца
ў неба начное і зорку шукаў.
Ціхім каханнем к табе разгарацца
з гэтай пары я пачаў.

Але расстацца нам час наступае
пэўна, ўжо доля такая у нас.
Моцна кахаў я цябе, дарагая,
але расстацца нам час.

Буду ў далёкім краю я нудзіцца,
ў сэрцы любоў затаіўшы сваю
кожную ночку на зорку дзівіцца
буду ў далёкім краю.

Глянь іншы раз на яе, — у расстанні
там з ёй зліём мы пагляды свае...
каб хоць на міг уваскрэсла каханне,
глянь іншы раз на яе...

Maksim Bahdanoviĉ

Stelo Venuso

Stelo Venus' super tero aperis,
rememorigis pri fora tener'...
Kiam renkontis mi vin, same helis
stelo Venus' super ter'.

De tiu temp' kun fidel' mi rigardas
noktan ĉielon, serĉante je l' stel'.
Amo kvieta al vi flagre ardas
de tiu temp' kun fidel'.

Tamen disigas nin sort' kaj destino;
mi ne revidos vin, certe, ĝis mort'.
Firme mi amis vin, ho karulino,
tamen disigas nin sort'.

Sur malproksima teren' mi sopiros,
amon kasinte en kor' kun ĉagren'.
Ĉiuvespere la stelon admiros
sur malproksima teren'.

Vidu ĝin foje kun trista silento, -
niaj rigardoj kuniĝos en dist'...
Ke reviviĝu la am' por momento,
vidu ĝin foje kun trist'...

Tradukis **Valentin Melnikov**

Сціплая інтэрнэт-прысутнасць беларускіх эсперантыстаў

Калі Людвік Заменгоф стварыў мову эсперанта, наўрад ці ён меркаваў, што праз сто з невялікім гадоў для яе развіцця жыцці створыць выдатныя ўмовы. Гэтыя ўмовы прапануе сёння інтэрнэт, які ў стане злучыць прыхільнікаў штучнай мовы з цэлага свету.

Праўда, нягледзячы на спрыяльныя варункі, у Беларусі такімі выгодамі прыхільнікі эсперанта не надта карыстаюцца. Калі ўзнікне жаданне пералічыць сайты ў Байнэце, што прысвечаныя эсперанта, то нават пальцаў адной рукі будзе зашмат. З чым звязана такая надта сціплая прысутнасць беларускіх эсперантыстаў у віртуальнай прасторы, кожны, пэўна, патлумачыць па-свойму — можа няма сярод іх апантаных карыстальнікаў інтэрнэта, можа іхні інтарэс да эсперанта яшчэ не такі моцны, каб прапагандаваць свае дзеянні на карысць гэтай мовы праз Сеціва, а можа ўласна беларускіх эсперантыстаў не так многа, каб мець патрэбу ў стасунках з аднадумцамі па цэлым свеце.

Разам з тым, сайты беларускіх эсперантыстаў, якія ўжо ці яшчэ існуюць, вартыя таго, каб засяродзіць на іх увагу.

Перш за ўсё, будзе карысным наведаць сайт, што месціцца па адрасе ***www.esperanto.pisem.net****. Выглядае ён можа не надта прывабна, але мае цікавы падзел старонкі на дзве мовы — беларускую і эсперанта. Кожная палова пазначана сваім сцягам. Таму, хто яшчэ не паспеў авалодаць штучнай мовай, трэба выкарыстаць беларускую частку, прайшоўшы па старонцы, дзе маюцца пытанні і адказы пра эсперанта. Менавіта там выдатна распавядаецца пра мову, якую Людвік Заменгоф меў на мэце зрабіць міжнароднай. Хоць адказы на пытанні даволі сціслыя, але гэта не адбіваецца негатыўна на іх сутнасці.*

Цікавым на даным сайце ёсць і заахвочванне да вывучэння эсперанта. Яно змяшчае нават нейкую інтрыгу. „Каб вывучыць эсперанта, патрэбна столькі месяцаў, сколькі гадоў патрэбна для вывучэньня якой-небудзь нацыянальнай мовы. Можна сказаць, што для беларускамоўнай асобы вучыць эсперанта ўдвая лягчэй за ангельскую, у пяць разоў за нямецкую, у дзесяць разоў за арабскую і бясконца лягчэй за японскую", — рэкламуюць штучную мову беларускія эсперантысты.

Найбольш важнай асаблівасцю данага сайта з'яўляецца тое, што змяшчае ён электронную версію падручніка „Мова эсперанта", які выдаў Адам Паўлюкавец. Спампаваўшы электронны варыянт кнігі, можна сесці і вывучыць за некалькі месяцаў, калі верыць эсперантысцкай рэкламе, мову Заменгофа. Дарэчы паглядзець, што менавіта за інфармацыя месціцца ў тым падручніку, можна зазірнуўшы на старонку ***http://www.geocities.com/DiPeLa/Paulukavec/****.*

Другім вартым для наведвання эсперантысцкім сайтам з'яўляецца ***http://zmila.at.tut.by/****. Ягоны гаспадар і аўтар — Зміцер Лапцёнак, згодна інфармацыі на сайце, — закаханы ў эсперанта чалавек. Інакш цяжка патлумачыць жаданне перакладаць на эсперанта літаратурныя творы з беларускай і рускай моў.*

Сайт Зміцера Лапцёнка падаецца яшчэ больш аматарскім, чым папярэдні, але ёсць выдатным дапаўненнем атрыманай раней інфармацыі аб штучнай мове.

І апошні сайт, які належыць беларускім эсперантыстам, месціцца па адрасе ***http://esperanto.by/****. Тут інфармацыі зусім мала, затое ёсць прывітанне ад суполкі эсперантыстаў на трох мовах — эсперанта, беларускай і рускай. Далей, праўда, усё надрукавана па-руску і існаванне многіх гіперспасылак не зусім зразумела. Таму для „эсперантоговорящих человеков", як яны самі сябе называюць, яшчэ ёсць праца над прывядзеннем сайта да належнага выгляду і функцыянавання.*

Уладзімір ЛАПЦЭВІЧ

І ☞працяг „Міжнародная рабочая сувязь на эсперанта”, выдадзенай у Маскве ў 1930 г.

Эсперантысты, якія былі прыхільнікамі савецкага ладу, запрашаліся ў Савецкі Саюз. У 1926 г. сужонства Міхалічкі з Аўстрыі наведалі Мінск, пабывалі на прадпрыемствах, у польскім педтэхнікуме і ў цэнтральным доме адпачынку, аб чым паведамлялі радыё і перыядычныя выданні. Спадарыня Міхалічка сказала тады: „Калі б я не ведала, што знаходжуся ў СССР, я б па адным гэтым цэнтральным рабочым клубе сказала, што знаходжуся ў краіне, дзе ўлада належыць рабочаму класу”. А шведскі эсперантыст Эйнар Адамсон з Гётэборга, які быў запрошаны ў СССР на святкаванні 10 гадавіны кастрычніцкай рэвалюцыі, выдаў на мове эсперанта кнігу „Пад чырвоным штандарам”, у якой Беларусі прысвечаны раздзел „У Мінску, сталіцы Беларускай Сацыялістычнай Рэспублікі”.

У 1930-х гг. нараджаецца ідэя выкарыстаць міжнародную мову ў вытворчасці. Зміцер Снежка ў часопісе „Международный язык” у 1931 г. пісаў пра магчымасць атрымання рабочымі неабходных чарцяжоў і падрабязнага апісання новых тэхналогій.

Эсперанта выкарыстоўвалася таксама для прапагандавання беларускай літаратуры. У замежных эсперанцкіх часопісах друкаваліся артыкулы аб беларускіх пісьменніках і беларускай літаратуры, творы Якуба Коласа, Янкі Купалы, Андрэя Александровіча, Платона Галавача, Цішкі Гартнага, Рыгора Кобеца і іншых перакладаліся на эсперанта. З нагоды прыезду ў Мінск японскага пісьменніка-эсперантыста Акіта Удзяку ў друку публікаваліся выказванні аб эсперанта, м.інш. Якуба Коласа, Янкі Купалы, Змітрака Бядулі.

У лютым 1926 г. у эфір выйшлі радыёперадачы на мове эсперанта. Па панядзелках 45-хвілінныя ўрокі міжнароднай мовы на мінскай радыёстанцыі вёў Янка Маўр. Перадачы для замежных слухачоў пачаткова раз на месяц, пазней двойчы на тыдзень, а ў 1935 г. дзесяць разоў на месяц рэдагавала Фіра Каганоўская, а рэвалюцыйныя і беларускія народныя песні на эсперанта выконваў саліст Дзяржаўнага тэатра оперы і балета Беларусі Мікалай Пігулеўскі.

Надышоў зларадны час сталінскіх рэпрэсій і найбольш актыўныя дзеячы эсперанцкага руху, які дагэтуль карыстаўся падтрымкай партыі і камсамола, раптам сталі шпіёнамі і ворагамі народа. За „сувязь з нацдэмаўскімі і фашысцкімі элементамі” ў 1936 г. быў арыштаваны Цішка Гартны (памёр у 1937 г.). Адам Іодка, па прафесіі архівіст, аўтар працы „Эсперанта перад судом навукі”, неабгрунтавана арыштаваны ў 1937 г. за „шпіянаж у карысць Польшчы”, прыгавораны быў да вышэйшай меры пакарання і расстраляны ў гэтым жа годзе. Пацярпеў таксама адзін з лідараў беларускага руху Зміцер Снежка, якога абвінавацілі ў антысавецкай дзейнасці. Рэдактар газеты „Беларуская вёска”, а пазней старшыня Беларускага радыёкамітэта Радыён Шукевіч-Траццякоў у 1938 г. быў сасланы ў Сібір, дзе загінуў у канцлагеры НКВД. Загадчык сектара перадач на эсперанта Беларускага дзяржаўнага радыё Ілья Элькін быў арыштаваны ў 1936 г. у Мінску і асуджаны пазасудовым органам НКВД за „антысавецкую агітацыю” да трох гадоў папраўча-працоўнай калоніі (далейшы яго лёс невядомы). Згаданы ўжо Георгій Дзешкін, арыштаваны ў 1938 г. у Маскве і абвінавачаны ў шпіянажы ў карысць Англіі, быў прыгавораны да васьмі гадоў папраўча-працоўных лагероў. У час допытаў прызнаўся, што „з ліку эсперантыстаў была створана шпіёнская арганізацыя”, а ён сам перадаў копіі дакументаў аб колькасці суднаў грамадзянскага флоту і аб забеспячэнні тэкстыльных фабрык бавоўнай (пазней гэтыя абвінавачанні былі судом прызнаны несапраўднымі, паколькі былі дадзены пад уплывам незаконных метадаў допытаў).

* * *

У той час эсперанцкі рух у Заходняй Беларусі развіваўся ў рамках Польскага саюза эсперантыстаў, але вялікі ўплыў на яго аказвалі таксама палітычныя і грамадскія арганізацыі. Напрыклад, член Камуністычнай партыі Заходняй Беларусі Л. Шапіра разгарнуў прапаганду эсперанта сярод членаў гэтай партыі, згуртаваў вакол сябе групу актывістаў, якія выкладалі эсперанта ў гуртках, выдавалі лістоўкі. Максім Танк, тады дзеяч падпольнага камсамола, у кнізе „Лісткі

Вокладка кнігі Міхаіла Мандрыка „Гаркавая дарога жыцця” на мове эсперанта, 1997 г.

календара” ўспамінае Віленскі студэнцкі гурток эсперантыстаў, куды ён разам з сябрам „хадзілі, каб стаць сапраўднымі інтэрнацыяналістамі. Мы тады лічылі, — піша Танк, — што нацыянальныя мовы з’яўляюцца перашкодай на гэтым шляху, бо які ты ў чорта інтэрнацыяналіст, калі прызнаеш толькі сваю мову і змушаеш на ёй гаварыць іншых”.

Шмат для эсперанцкага руху зрабіў адзін з лідараў Таварыства беларускай школы, выдавец, мемуарыст, педагог і юрыст Фелікс Стацкевіч. Між іншым, склаў ён „Эсперанта-беларускі слоўнік”, рукапіс якога захоўваецца ў Інстытуце мовазнаўства Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі, пераклаў на эсперанта кнігу Лявона Петражыцкага „Тэорыя права і маральнасць”. Эсперантыстам быў таксама паэт Сяргей Новік-Пяюн — дзеяч ТБШ, арганізатар беларускай бібліятэкі і тайнай школы ў Лявонавічах, за што ў 1926 годзе быў высланы польскімі ўладамі ў Свеце над Віслай. У высылцы на Памор’і не хацеў ён заставацца адзінокім, шукаў кантакту з шырокім светам і захапіўся эсперанта, якое стала адной з моў ягонай творчасці (пісаў у асноўным на беларускай, але таксама яшчэ на рускай і польскай мовах). Найбольш вядомая песня на словы Новіка-Пяюна „Зорачкі” напісана ім і на мове эсперанта. Напісаў ён таксама тэкст „Гімна эсперантыстаў”.

У даваеннай Вільні дзейнічала некалькі гурткоў эсперантыстаў, была вуліца Заменгофа. Згуртаванні эсперантыстаў працавалі ў Брэсце, Баранавічах, Пінску і ў іншых гарадах, мястэчках і нават вёсках.

* * *

У пасляваеннай Беларусі эсперанцкі рух аднавіўся ў 1955 г. па ініцыятыве дацэнта Мінскага педагагічнага інстытута П. Кірушына і пісьменніка Янкі Маўра. Ужо ў наступным годзе ў перыёдыцы з’яўляюцца артыкулы пра эсперанта, ствараюцца гурткі, адкрываюцца курсы. Напрыклад, на першыя курсы эсперанта ў Беларускім дзяржаўным універсітэце запісалася 250 чалавек. У 1957 г. у Мінску стварылася ініцыятыўная група па згуртаванні аматараў эсперанта, якая абрала часовае бюро з пяці чалавек, а Янка Маўр на старонках часопіса „Беларусь” выступіў з артыкулам „Эсперанта”. У выніку ініцыятыўная група эсперантыстаў атрымала сотні пісем з пытаннямі пра падручнікі, слоўнікі і курсы па вывучэнню эсперанта. Па-за Мінскам гурткі стварыліся ў Маладзечне, Паставах, Барысаве, Оршы, Мазыры, Любані.

У снежні 1957 г. рэспубліканскі сход эсперантыстаў прыняў рашэнне аб стварэнні Саюза эсперантыстаў Беларусі, ганаровым старшынёй якога абраны быў Янка Маўр. Неадкладна пасля сходу Цэнтральнае Бюро СЭБ накіравала ў Савет Міністраў БССР прашэнне аб рэгістрацыі Саюза эсперантыстаў Беларусі, але адгэтуль адказ ніколі не паступіў. Нягледзячы на ненармалізаванае юрыдычнае становішча эсперантысты працягвалі дзейнасць. Новыя гурткі ўзніклі у Магілёве, Віцебску, Полацку, Горках, Чэрвені, Старых Дарогах, Гомелі, Рэчыцы, Глуску, Ліпску.

У 1960-х гадах ва ўстановах культуры ўводзіцца новая форма культурна-масавай работы — клубы па інтарэсах, у рамках якіх пачынаюць дзейнасць клубы эсперантыстаў. Першы такі клуб „Amikeco” („Дружба”) пачаў дзейнасць пры Мінскім педагагічным інстытуце замежных моў у 1964 г. У 1967 г. гэты ж клуб правёў работу пад дэвізам „Беларускую літаратуру замежнаму чытачу”, але вынікі аказаліся мізэрнымі (перакладаліся невялікія апавяданні або фрагменты буйных твораў). Таму ў 1974 г. клубам быў аб’яўлены конкурс на пераклад беларускай паэзіі, у якім прынялі ўдзел эсперантысты з Літвы, Латвіі, Украіны, Узбекістана. Плён іх працы друкаваўся ў машынапісных „Беларусіх паэтычных сшытках” (выйшлі тры выпускі тыражом па 30 экземпляраў кожны). Пазней гэтыя пераклады друкаваліся ў эсперанкіх выданнях Балгарыі, Чэхаславакіі, Венгрыі, Германскай Дэмакратычнай Рэспублікі.

Другі эсперанцкі клуб „Эсперанта” быў створаны пры Палацы Беларускіх савецкіх прафсаюзаў у Мінску ў 1967 г. Наладзіў ён сувязь з эсперантыстамі савецкіх рэспублік, а таксама іншых краін: Балгарыі, Польшчы, ГДР, Югаславіі, В’етнама, Чэхаславакіі, Замбіі, Японіі, Аўстраліі, Францыі, Швецыі. План працы клуба прадугледжваў вывучэнне мовы эсперанта, ладжанне вечароў інтэрнацыянальнай дружбы, выступленні ў абарону міру і ўмацаванне дружбы паміж народамі. У пачатку 1980-х гадоў клуб правёў работу па сарганізаванні эсперанта-клубаў у абласных цэнтрах. У выніку ў 1981 г. пачаў працу клуб „Цытадэль” у Брэсце (кіраўнік Віктар Яраш эвіч). Пазней клубы эсперантыстаў з’явіліся ў Віцебску, Магілёве, Гродне, Гомелі, а таксама ў Лідзе і Ваўкавыску, а ў самім Мінску ўзніклі яшчэ два клубы: „Verda lumo” („Зялёнае святло”) пры Доме культуры „Прамбудмантаж” і „Bonvenon” („Сардэчна запрашаем”) пры Доме культуры бытавога абслугоўвання.

У 1980-х гг. эсперантысты арганізавалі шмат мерапрыемстваў, прымеркаваных да важных гадавін, напрыклад, да 100-годдзя з дня нараджэння Янкі Маўра, 60-годдзя арганізаванага руху эсперантыстаў у Беларусі. У падрыхтоўцы эсперанцкіх мерапрыемстваў удзельнічалі артысты і кампазітары. Гэтыя астатнія пісалі музыку на словы беларускіх паэтаў эсперантыстаў: Уладзіміра Данілава (Мазыр), Леанарды Волкавай (Гродна), Людмілы Сільновай, Ігара Белякоўскага і Алы Фрадман (Мінск).

* * *

Пасля развалу Савецкага Саюза распаліся і структуры эсперанцкага руху. Цяпер з былых рэспублік СССР толькі ў Беларусі няма сваёй асацыяцыі і клубаў. Спроба аднавіць рух была зроблена ў пачатку 1990-х гадоў. Створана тады была Асацыяцыя эсперантыстаў Беларусі з сядзібай у Гродне. Але АЭБ з прыходам да ўлады Алясандра Лукашэнкі ціха памерла, так як іншыя няўрадавыя арганізацыі.

Аднак прыхільнікі эсперанта ў Рэспубліцы Беларусь не звяліся. „У Беларусі ёсць некалькі эсперантыстаў, — сказаў нам мінскі эсперантыст Зміцер Лапцёнак, — частка з іх часам камунікуюць праз інтэрнэт, або сустракаюцца ўжывую, некаторыя ўдзельнічаюць у міжнародных сустрэчах, кангрэсах, вандруюць па свеце з дапамогай эсперанта. Ніякіх адмысловых эсперанцкіх мерапрыемстваў, падзей, курсаў у нас не абдываецца. Кантакты з замежнымі эсперантыстамі — на асабістым узроўні. Арганізацыі беларускіх эсперантыстаў няма. Мне вельмі прыкра даваць такі нярадасны адказ, але лёс склаўся так... (дакладней — мы не склалі лёс інакш, але гэта ўжо іншае пытанне)”. Сам Зміцер Лапцёнак, па прафесіі праграміст, на эсперанта піша вершы і перакладае раман Уладзіміра Караткевіча „Хрыстос прызямліўся ў Гародні”.

У 1992 г. у мінскім выдавецтве „Навука і тэхніка” беларускі эсперантыст Адам Паўлюкавец (1939-1994) выдаў першы беларускамоўны падручнік „Мова эсперанта. Практычны дапаможнік”. У ім аўтар змясціў нарыс па гісторыі эсперанцкага руху ў Беларусі, практычную граматыку, практыкаванні і навучальныя тэксты, узоры беларускай паэзіі на мове эсперанта, эсперанта-беларускі слоўнік і бібліяграфію. Падручнік поўнасцю даступны ў інтэрнэце. Адам Паўлюкавец пераклаў таксама шмат паэтычных твораў з беларускай мовы на эсперанта.

У 1997 годзе амерыканскія эсперантысты надрукавалі кніжку „Amara vivovojo” („Гаркавая дарога жыцця”) — аўтабіяграфічную аповесць Міхаіла Мандрыка, былога намесніка старшыні Саюза эсперантыстаў Беларусі (з 1959 г.), аўтара ілюстраванага слоўніка і падручніка эсперанта.

Цяпер адзінай стабільнай прасторай кантактаў беларускіх эсперантыстаў застаецца інтэрнэт.